# Сказание о Первомайской земле

**Отдел образования Щучинского райисполкома**
**Государственное учреждение образования**
**«Учебно-педагогический комплекс Первомайский детский сад – общеобразовательная средняя школа»**

# Сказание о Первомайской земле

**историко – этнографический очерк**

**Первомайск 2010**

ББК 74.200
Печатается по согласованию с координационным советом по реализации проекта «Путешествие по Первомайскому кольцу» при Первомайской СШ

Авторы-составители: Н.С. Дашкевич, педагог-организатор Первомайской СШ; Т.П. Сидляревич, педагог социальный; Н.И. Гудач, учитель истории Первомайской СШ.

Рецензент: Н.И. Лебедевич, методист Остринского ЦВР

ББК 74.200
Сказание о первомайской земле: историко-этнографический очерк/ авторы – составители: Н.С. Дашкевич, Т. П. Сидляревич, Н. И. Гудач. –Учреждение образования “УПК Первомайский детский сад-общеобразовательная средняя школа”, 2010. – 36 с.

Краеведение является важным педагогическим средством патриотического, нравственного, трудового и эстетического воспитания. В историко – этнографическом очерке показана связь школьников с жизнью родного края, с его художественной культурой и людьми. Краеведение способствует вовлечению учащихся в творчество, самодеятельность, расширяет возможности активной пропаганды знаний об истории родного края и особенностях его современной жизни.
Адресуется воспитателям детских оздоровительных лагерей, педагогам общеобразовательных школ, руководителям кружков краеведческой направленности.

Государственное учреждение образования
«Учебно-педагогический комплекс Первомайский детский сад – общеобразовательная средняя школа»
231544 ул. .Школьная,1, д.Первомайская,
Щучинский р-н, Гродненская обл.
**Тел. 8(01514) 3532 e-mail: perwom@mail.ru.**

## Содержание

1. Приложение 1. Карта и описание объектов историко-краеведческой тропы……………………………………6
2. Приложение 2. Исследовательская работа «На зорных шляхах вечнасці»..……………………………………21
3. Приложение 3. Календарь народных праздников первомайского края……………………………………..30
4. Приложение 4. По следам творческой экспедиции «Память пылающих лет»……………………………………..43
5. Приложение 5. Сценарий фольклорного праздника «Беларускія вячоркі»……………………………………52
6. Приложение 6. Устный журнал «Наших душ карані»…..58

Приложение 1

# Историко – краеведческая тропа

## Схема тропы



# Карта-врезка д. Первомайская



## Обзорные точки историко-краеведческой тропы

Дети участвуют в экскурсиях по окрестностям лагеря, знакомятся с различными объектами, выбирают обзорные точки тропы и прокладывают наиболее удобные пути между ними. На маршруте историко-краеведческой тропы, протяженность которой составила около 12 км, отмечено 17 обзорных точек:

1. Могила А.С.Пашкевич (Цётка).
2. Староподдубенский валун.
3. Могила семьи Алесневич в д.Таболичи.
4. д.Первомайская
   1) Первомайский детский сад – средняя школа.
   2) Историко-краеведческий школьный музей.
   3) Здание красной школы
   4) Святопокровская церковь.
   5) Памятник погибшим воинам во время Великой Отечественной войны.
   6) Костёл Воздвижения Святого креста
   7) Заказник «Котра» (в офисе заказника разработаны свои экологические тропы для туристов).
   8) Школьный дендрарий.
5. Библиотека-музей в д.Кулеши.
6. Пограничный пост д.Мотыли.
7. Приусадебно-парковый комплекс в д. Мотыли.
8. Музейный уголок Л.Нарбута в Дудковской БШ.
9. Мемориальный комплекс Огородище.

## Примеры иллюстраций к описанию историко-краеведческой тропы

### История названия деревни Первомайская

*Прыйдуць людзі ...*
*І спытаюць Нас.*
*"Скуль, якога Вы роду?*
*Дзе зямля Ваша будзе,*
*Дзе Айчына ў Вас?*
*Я. Купала*

Деревня Первомайская известна с 15 века. Первоначальное название её название было Забалацце. Название хорошо отображало природные особенности этой местности, но создавала и путаницу. Дело в том, что в десяти километрах от современной деревни Первомайская располагалось местечко Заболоть в нынешнем Вороновском районе. Поэтому, когда в 1550 году деревня Забалацце была передана перебежчику из Москвы Боярину Михаилу Сабакину, то местное поселение стали называть деревней Сабакинцы. Под названием Сабакинцы деревня просуществовала более 300 лет, даже некоторое время считалось местечком.

Во второй половине 18 столетия грубое мужицкое название Сабакинцы не стало восприниматься шляхтой, на них подействовало увлечение античной культурой и французским просвещением. Чтоб предать Сабакинцам более нежного звучание шляхта начала употреблять новую форму – Собокинцы. Но крестьяне не понимали польской милозвучности и употребляли прежнее название Сабакинцы.

В 60 годах 19 столетия со стороны православных священников появилось предложение переименовать Собокинцы в село Покровское или просто Покровы (старое название местной церкви Покровы Пресвятой Богородицы). Это предложение обсуждалось почти 30 лет, во время которых местечко называлось то Покровским, то Собокинцами. В сентябре 1899 года губернское правление в Вильни окончательно утвердило новое название – Покровское.

Не успело поселение привыкнуть к новому названию, как началась Первая Мировая война, Октябрьская революция, в итоге которых Щучинщина стала частью Польского государства. Новые власти сразу отказались от названия Покровское и возвратились к старому названию Собокинцы.

Но вскоре польским властям, тоже, не понравилось название Собокинцы, и в середине 30-х годов 20 столетия появился проект переименовать Собокинцы в Нарбутово – в честь одного из руководителей восстания 1863-1864 годов Людвига Нарбута.

2 июля 1939 года прошло официальное торжество в честь присвоения местечку нового названия – Нарбутово.

Не успело новое название прижиться, как в сентябре 1939года началась вторая мировая война, первой жертвой которой стала Польша. Трёх месяцев не пробыв название Нарбутово, снова было переименовано в Сабакинцы.

Под этим названием населённый пункт пережил тяжёлые годы войны и был освобожден 12 июля 1944 года.

В начале пятидесятых годов было обращено внимание на неуместное название одного из сельских Советов – Сабакинский. Чтобы решить этот вопрос в 1954 году деревня Сабакинцы была переименована в Первомайскую, а местный сельский Совет стал Первомайским.

Таким образом, на протяжении своей 500 – летней истории нынешняя деревня Первомайская изменила 6 названий: Забалацце

Сабакинцы
Собокинцы
Покровское
Нарбутово
Первомайская

## Першамайскі дзіцячы сад – сярэдняя школа



Знаходзіцца у цэнтры вёскі Першамайская . У 1939 годзе была адкрыта Сабакінская сямігадовая школа. У 1950 годзе Сабакінская сямігадовая школа была перетворана ў сярэднюю школу. З лета 1954 года Сабакінская школа стала называцца Першамайскай.

У 1974 годзе пабудавана новая Першамайская сярэдняя школа. У школе 16 вучэбных кабінетаў, спартзал, актавы зал, сталовая, бібліятэка.

## Архітэктурныя помнікі

### Святапакроўская царква у вёсцы Першамайская,

Шчучынскага раёна, Гродзенскай вобласці. Поўная назва царквы – мацеры Божай Пакровы. У пачатку царква была драўлянай. У царкве была Цудатворная ікона Багародзіцы невядомага майстра, пры якой вісеў вотум (воля, давер) з серабра ахвяраваны праз Станіслава Ляшчынскага з надпісам на польскай мове «Найяснейший Лещинский король польский прибывший к Чудотворной иконе Матери Божьей пешью такой обет дал в 1705 году» (арх. Краева опись губ. Виленской 549)



У 1830 годзе на месцы драўлянай царквы пабудована у вёсцы Першамайская Святапакроўская царква з бутавага каменю і цэглы ў стылю неакласіцызму з элементамі барока, помнік рэтраспектывы – рускага стылю. Прамавугольны ў плане аб’ём пад вальмаваным дахам на галоўным фасадзе мае прыстроеную двухярусную (васмерык на чацвярык) шатровую званіцу. На фоне поліхромнай бутавай кладкі сцен створаны з дапамогай тынкоўкі элементы архітэктурнага дэкору, аркатурныя фрызы , руставалыя вуглавыя лапаткі, налічнікі ваконных праёмаў

У 1948 годзе была пашкоджана пажарам.

## Першамайскі касцёл “Узвышэння святога крыжа”

У 1920 годзе адкрываецца касцёл пад вызваннем “Узвышэнне святога крыжа”, і утвараецца Сабакінская парафія.

Тагачаснае месцазнаходжанне касцёла не супадае з сучасным яго размяшчэннем. У той час касцёл знаходзіўся на паўднёвым усходзе вёскі Першамайская, а калі дакладней, то каля сучасных праваслаўных могілак, меў выгляд звычайнага драўлянага дома.



22 мая 1929 года быў зацверджаны план будаўніцтва касцёла дзяржаўнай Радай у Вільні - праект Сабакінскага касцёла. Будаўніцтва касцёла вялося пад кіраўніцтвам ксяндза Адольфа Гродзіса.

У 1938 годзе пабудавалі касцёл – святыня сучаснага стылю. Але ў час Вялікай Айчыннай вайны будынак згарэў.

У 1989-1990 гадах парафіяне сабралі добраахвотныя ахвяраванні.

І у канцы 1990 года касцёл быў адрамантаваны. Узведзены вежы, вышыня якіх дасягае больш як 20 м.

У касцёле знаходзіцца адзін галоўны алтар (ахвяравальнік) “Узвышэнне Святога Крыжа “ І два пабочныя : левы – Міласэрнасці Божай , правы – Маткі Божай Вострабрамскай.

## Будынак чырвонай школы у в. Першамайская

Помнік архітэктуры XIX ст. Пабудаваны як царкоўна - прыхадская школа ў 1864 годзе.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў будынку размяшчалася нямецкая камендатура і гестапа. Насупраць стаяў нямецкі гарнізон.



Успаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны сведчаць а тым, што ад будынка і да возера быў пракапаны глыбокі падземны тунель, па якім немцы вадзілі на расстрэл палонных партызан ці мясцовых жыхароў, якія не жадалі падпарадкоўвацца новай уладзе.

У пасляваенны час будынак выкарыстоўваўся як мясцовая навучальная ўстанова, а затым як дом-інтэрнат для дзяцей, якія жылі далёка ад школы.

Сёння будынак знаходзіцца ў вельмі запушчаным становішчы.

## Сядзібна-паркавы комплекс у вёсцы Матылі

Сядзібна-паркавы комплекс знаходзіцца на ўсходзе ад вёскі Матылі, в ўрочышчы Марцылютка. Двухпавярховая пабудова з гаспадарчымі пабудовамі. Вакол Галоўнай пабудовы быў разбіты пладовы сад, з дэкаратыўнымі раслінамі.

З 1949г. сядзіба пераходзіць пад школу.

У 1965г. школа пераходзіць у новую школу у 300 метрах ад урочышча Марцылютка. У хуткім часе школа і гаспадарчыя пабудовы былі разабраны.

На сённяшні дзень ні ад усадзьбы засталіся толькі падмуркі пабудоў. Парк і пладовыя дрэвы не захаваліся, толькі некаторыя кусты працягваюць расці на сваіх былых месцах.

# Помнікі

## Брацкая магіла у в. Першамайская



Абеліск пастаўлены у 1975 годзе. Знаходзяцца брацкія магілы трох невядомых партызан з атрада генерал - маёра П.П.Капусты; васьмі мірных жыхароў, расстраляных у 1943 годзе гітлераўцамі: Альбертскі Уладзіслаў, Альбертская Марыя Якаўлена, сын Бартош, дачка Крыстына, Кухарскі Іосіф, Пашынская Таццяна, Бушман Адам, палтарацкая Алена.

Тэкст надпісу на помніку: «Вечная слава павшим в боях с немецкими захватчиками за свободу нашей Родины 1941 – 1945 гг.».Знаходзіцца у добрым стане, даглядаецца вучнямі Першамайская сярэдняй школы.

## Помнік сям'і Алясневіч у вёсцы Табалічы



Знаходзіцца на паўночным - усходзе у 0,5 км ад вёскі Табалічы ў лесе.

Сям'я Алясневіч была расстраляна ў 1944 годзе фашысцкімі захопнікамі за сувязь бацькі Алясневіча Івана Іванавіча (1905г.н.) з партызанамі. Загінулі: жонка Алясневіч Ганна Валянцінаўна (1908г.н.), тры дачкі: Юзафа (1933г.н.), Яніна (1934г.н.), Зінаіда (1936г.н.). Пахаваны ў лесе каля в. Табалічы. Старэйшая дачка Алясневіч Марыя Іванаўна (1927г.н.) ў гэты час была вывезена на работы ў Германію. Калі вярнулася, то

даведалася аб трагедыі. Доўгі час жыла ў Эстоніі. На сённяшні дзень пражывае ў в. Табалічы.

Помнік быў узведзены ў 1989 годзе на дзяржаўныя сродкі.

Знаходзіцца ў добрым стане, даглядаецца вучнямі Першамайскага ВПК “Дзіцячы – сад сярэдняя школа”.

**Магіла Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч (Цётка) у вёсцы Стары Двор**



Магіла знаходзіцца на поўдні вёскі Стары Двор. Даглядаецца вучнямі Хадзілонскай школы.

У сувязі з 125 –годдзем з дня нараджэння паэтэсы ў 2006 годзе адбылося поўная рэстаўрацыя помніка і абнаўленне прылеглай тэрыторыі.

Знаходзіцца ў добрым стане.




## Агародзішча

Вёска ў Першамайскім сельскім савеце. Размешчана ў лясным масіве заказніка, на левым беразе ракі Котра. Спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 годзе 26 лютага, за сувязь мясцовых жыхароў з партызанамі. 500 гітлераўцаў акружылі вёску, прыкладамі і штыкамі загналі ўсіх жыхароў у хату Мацвея Саковіча. Мужчынам загадалі выкапаць яму, затым пачалі выводзіць па 10 чалавек і падганяць да ямы. Спачатку стралялі з аўтаматаў і кулямётаў, а затым у яму кінулі некалькі гранат. Многія спрабавалі ўцякаць, але куды ж ты ўцячэш, калі

кругом куляметы і далёка да лесу. Варожыя кулі даганялі тых, хто ўсё ж рашаўся выратавацца.



Такім чынам, было спалена 28 хат, 147 жыхароў.

Побач з р.Котра стаіць вялікі помнік з чырвонай зоркай наверсе. На ім надпіс: “Тут пахаваны 147 жыхароў в.Агародзішча, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі 26 лютага 1943 года”.

Помнік быў пастаўлены ў 1962 годзе, а ў 2001 годзе, у гонар святкавання 60-годдзя Пачатку вялікай Айчыннай вайны, помнік і захаванні былі кардынальна рэканструяваны.

Замацаваны і даглядаецца вучнямі Матыльскай базавай школы, адміністрацыяй Першамайскага с/с.

## Геалагічныя помнікі

### Старападдубенскі валун




Геалагічны помнік прыроды. Месцазнаходжанне: Гродзенская вобласць, Шчучынскі раён, вёска Старыя Паддубы. У паўночна-



заходняй частцы вёскі Старыя Паддубы, у 11 кіламетрах на паўночным-усходзе ад вёскі Новы Двор, у 29 кіламетрах на поўнач ад горада Шчучын. Землекарыстальнік і арандатар , на зямельным участку якога знаходзіцца помнік прыроды КУП “саўгас “Першамайск - Агра”.

Плошча помніка прыроды 5,51 $м^2$. Валун складаецца з граніту рапаківі бура-жоўтага кулуараў з авоідам палявога шпата дыяметрам ад 2 да 8 сантыметраў. Даўжыня доўгай восі каменя – 2,9 метра, кароткай – 1,9 метра, вышыня – 1,3 метра, акружнасць – 8,2 метра, вага – 19 тон. Валун з арыентаваны у паўночна-заходнім накірунку (азімут $325^0$) і прынесены ледавіком з Выбаргскага масіву Ленінградскай вобласці Расіі каля 200 тысяч год назад. Валун "Старападдубенскі" у 1953 годзе меў статус помніка прыроды і ахоўваўся уладамі.

## Музеі і музейныя куткі

### Гісторыка краязнаўчы музей Першамайскай сярэдняй школы



Заснаваны 22 красавіка 1982 года. Складаецца з 4-х пакояў і сховішча экспанатаў. Два залы прысвечаны этнаграфіі, адзін пакой Вялікай Айчыннай вайне і адзін гісторыі Першамайскай сярэдняй школы.

### Краязнаўчы куток Дудкоўскай базавай школы



Экспазіцыя знаходзіцца ў адным з класаў Дудкоўскай базавай школы. Матэрыялы экспазіцыі размешчаны на 7-і стэндах: адзін з іх змяшчае фота Людвіка Нарбута ў афіцэрскім мундзіры, малюнак - копія родавага герба Нарбутаў, радавод Нарбутаў;

на другім стэндзе копіі партрэтаў і фотаздымкаў бацькі Людвіка Тэадора, яго маці Хрысціны, братоў Баляслава, Францішка, Станіслава і сястры Тэадоры - удзельнікаў паўстання, копія гравюры таго часу "Родавы маёнтак Нарбутаў Шаўры";

трэці стэнд носіць назву "Хроніка баявых дзеянняў атрада Людвіка Нарбута", маецца некалькі карт з польскіх выданняў, копія карціны М. Андрыёлі "Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў";

адзін са стэндаў расказвае пра паплечнікаў Нарбута і змяшчае партрэты М. Андрыёлі і Ф. Багушэвіча, копіі судовых дакументаў аб прыцягненні да адказнасці за садзейнічанне паўстанцам бацькоў Людвіка Нарбута і яго сястры, спісы праходзіўшых па суду іншых удзельнікаў паўстання з нашай мясцовасці;

матэрыялы наступнага стэнда - фотаздымкі з месцаў ушанавання памяці Людвіка Нарбута і членаў яго сям'і;

астатнія два стэнды прысвечаны Кастусю Каліноўскаму і тэме паўстання 1863 г. ў мастацтве.

## Бібліятэка - музей у вёсцы Замасцяны



Музейны пакой заснаваны на базе бібліятэкі знаходзіцца ў цэнтры вёскі Замасцяны. У музеі сабраны матэрыялы этнаграфічнага характару. У музеі знаходзяцца кросны і другія прылад ткацтва, зроблены збор народнага фальклору.

# Грамадскія ўстановы

## Рэспубліканскі ландшафтны заказнік “Котра”



Створаны Пастанаўленнем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №811 ад 19 чэрвеня 2003 г. Стварэнне заказніка “Котра” рабілася з мэтай захавання каштоўных ландшафтаў і раслінных аб’яднанняў , ствараючых адзіны прыродны комплекс з запаведнікам “Чапкяляй” на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі.

Заказнік “Котра” размешчаны ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці ў вярхоўі ракі Котра (басейне Нёмана) і мяжуе з літоўскім запаведнікам “Чапкяляй”. Даліна ракі Котра ў межах заказніка састаўляе каля 35 кіламетраў, шырыня 10-20 метраў.

Плошча заказніка – 10,584 гектара.

Пераважаюць хвойныя лясы, якія размяшчаюцца на балоцістых глебах. У пойме ракі Котра і ў цэнтральнай частцы заказніка адзначаны сляды пражывання рысі, а ў Новадворскім і Першамайскім лясніцтвах – барсука. Гэтыя жывёлы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.



У заказніку Котра багаты раслінны свет. Рэдкія віды раслін занесены у Чырвоныя кнігу Рэспублікі Беларусь, такія як: баранец звычайны, арніка горная, лілія кудравая, чына горная, прастрэл лугавы, сіела прамая,

пальчатокареннік балційскі, шпажнік чэрэпічны, пололепестнік зялёны, любка зялёнацветная, тайнік яйцэвідны, мякотніца аднагалістая, зубянка клубненосная, касацік сібірскі.

## Калектыўнае сельскагаспадарчае унітарнае прадпрыемства“Саўгас “Першамайск-Агра”

Першы калгас на тэрыторыі в.Першамайская быў утвораны ў 1950г.



Пачынаючы з 1961 года калгас быў пераіменаваны ў саўгас “Першамайскі”. З 1988 года вёска Першамайская становіца цэнтрам калгаса “Радзіма”. Паступова тэрыторыя калгаса пашыралася. Так, напрыклад, у чэрвені 2004 г. да калгаса “Радзіма” далучылася тэрыторыя саўгаса “Сцяг Саветаў” (цэнтр - в.Матылі), а ў лютым 2008 г. – КУП “Хадзілоні” (цэнтр – в. Хадзілоні). Аб’яднаная гаспадарка носіць назву КСУП “Саўгас “Першамайск – Агра” з цэнтрам у в. Першамайская. Кіраўніком гаспадаркі з’яўляецца Янковіч Уладзімір Сцяпанавіч.

На сённяшні дзень калгас займае плошчу ў 6088 тыс.га., з іх пашы займаюць 2787 тыс. га., а сенакосу – 3379 тыс.га.

## Пагранічны пост у вёсцы Матылі



Пабудаваны ў вёсцы Матылі ў 2006 годзе, для кантролю за Беларуска-Літоўскай мяжой. Фінансавалі пабудову Беларускі і Расійскі бакі.

**Приложение 2**

**Даследчая работа**
**ўдзельнікаў гісторыка – краязнаўчай гульні**
**“Путешествие по Первомайскому кольцу”**

# "На зорных шалях вечнасці"

**Прысвечаная жыццю і творчасці**
**паэта Уладзіміра Валяр’янавіча Руля**



# Уводзіны

Калі гэту зямлю ўбачыш хоць раз у жыцці – не забудзеш. Калі з чыстых яе крыніц вып’еш глыток вады – прыбавіцца сіл і радасці. Калі пройдзеш па гэтай зямлі – палюбіш яе.

А калі нарадзіўся на гэтай зямлі, то дзе б не апынуўся, сэрца будзе неадступна клікаць да лясных і азёрных даляў, да духмянага чабору на ўзгорку ды жытнёвага поля. Будзеш бачыць родную зямлю то цяжкім коласам, то сенажаццю, то бульбай, спечанай у попеле вогнішча, заўсёды будзеш чуць яе песні – сумныя, вясёлыя, жаўрукова-радасныя, з маленства і на ўсё жыццё – родныя.

Таму гэту працу мы прысвячаем таленту нашай роднай першамайскай зямліцы, таму, хто яе праславіў і апеў. А зямліца нарадзіла, узгадавала і дала крылы для магутнага палёту нашаму земляку, паэту Уладзіміру Валяр’янавічу Рулю. Ён - наш гонар.

Нажаль гэты чалавек яшчэ мала вядомы як паэт у шчучынскім краі, але яго, затое, вельмі добра ведаюць у Воранаўскім раёне.

Каб выправіць гэту недарэчнасць, мы разам з настаўніцай гісторыі Гудач Наталляй Іосіфаўнай выхавацелям атрада “Следопыты”, паставілі для сябе мэту: пазнаёміць нашых землякоў і ўсіх шчучынцаў з гэтым цікавым, неардзінарным чалавекам, акрэсліць шматграннасць асобы аўтара, пазнаёміць з першым зборнікам вершаў паэта.

Здавалася, задача – невырашальная. Але паступова, крок за крокам, па крысе, мы набылі вельмі многа звестак пра нашага земляка. Дапамагла нам у гэтым маці паэта Ніна Цімафееўна Руль, якая яшчэ і сёння пражывае ў вёсцы Матылі. Менавіта яна, пад час сустрэчы, апавядала нам пра дзяцінства Уладзіміра. А яшчэ і сам Уладзімір Валяр’янавіч, які з радасцю згадзіўся пагутарыць з нашым кіраўнікам па тэлефоне.

Каб мець поўнае прадстаўленне аб гэтым чалавеку, мы па чарзе прачыталі зборнік вершаў Уладзіміра Валяр’янавіча пад

назвай “На зорных шалях вечнасці”. (Менавіта так мы назвалі нашу працу).

Па тых вершах, якія прадстаўлены аўтарам у зборніку, можна меркаваць, што перад намі самабытны паэт. Уладзімір Руль адмыслова валодае паэтычным словам, асновамі вершаскладання. Яго лірычныя вобразы яскравыя, шчырыя і цікавыя.

Аўтару падуладныя тэмы і жанры паэзіі: ад лірыкі і патэтыкі да альбомных прысвячэнняў і сюжэтнай, недзе нават Коласаўскай, паэмнасці.

Асобна хочацца адзначыць мову паэзіі Ул. Руля. Яна глыбока народная., адначасова, літаратурна-сучасная, дзе кожнае слоўца не дзеля красамоўства, а трапнае, важкае, “смачнае”. Адной з характэрных асаблівасцяў паэзіі Уладзіміра Валяр’янавіча з’яўляецца, таксама яе песеннасць.

Вельмі выпукла праступае праз вершы постаць і светапогляд самога аўтара-паэта. Відавочна, што гэта, у першую чаргу, чалавек, горача ўлюбёны ў сваю зямлю, цесна знітаваны са ваім родам і народам (паэма “Мой род”), неабыякавы да лёсаў землякоў і суайчыннікаў (вершы “Землякам”, “Смельчакам”, “Беларусі” і іншыя).

Чытаючы творы Ул. Руля, шчыра верыш у тое, што паэт заўсёды будзе “служыць сваёй Айчыне”.

Імя яго не назавеш шырока вядомым, але без яго асобы не будзе поўнай карціны нашага літаратурнага жыцця, нашай культурнай спадчыны.

Біяграфія Уладзіміра Валяр’янавіча Руля пачалася тыпова. Нарадзіўся хлопчык ў вёсцы Матылі Першамайскага сельсавета, Шчучынскага раёна, Гродзенскай вобласці 3 верасня 1953 года. Бацька і маці яго былі настаўнікамі, людзьмі творчымі.

Базавуюа адукацыю Уладзімір атрымліваў ў Матыльскай базавай школе, а сярэднюю - ў Першамайскай сярэдняй школе ў 1970 годзе.

Дзяцінства Уладзіміра прайшло ў працы: дапамагаў бацьку пад час сенакосу, маці – пры зборы ягад на Ройсце. На ўсё жыццё запомніліся яму маляўнічыя краявіды роднай вёскі,

запалі ў душу гаспадарлівыя, гасцінныя людзі. Тут, у Матылях, яму знаёмыя кожная хата, мясціна, сям'я. Менавіта ў гэты час пачынаў пісаць свае вершы.

У 1975 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, а ў 1992 годзе Мінскі дзяржаўны педінстытут.

Некаторы час працаваў інжынерам-электрыкам у калектыўных гаспадарках Шчучынскага і Воранаўскага раёнаў, інструктарам аргаддзела Воранаўскага РК КПБ, сакратаром партарганізацыі мясцовага калгаса "Светлы шлях".

З 1987 па 1995 года выкладаў гісторыю спачатку ў Енчынскай базавай, а затым у Нацкай сярэдняй школах Воранаўскага раёна.

З 1995 па 2001 год – індывідуальны прадпрымальнік.

Сёння Уладзімір Валяр'янавіч пражывае ў в. Нача Воранаўскага раёна. Жанаты. Выхоўвае траіх дзяцей, займаецца больш хатняй гаспадаркай і сваёй творчасцю, а менавіта яе фінансавым бокам: шукае сродкі для выпуску сваіх кніг.

Будучы яшчэ студэндам Уладзімір успамінае пра сваё дзіцячае захапленне - пісаць вершы. Такім чынам, 70-я – 80-я гады самыя плённыя ў творчасці аўтара, але не ўсе вершы гэтага часу захаваліся да сённяшніх дзён. 90-я гады сталі для паэта сапраўдным выпрабаваннем: час духоўнага і творчага крызісу, пра якія Уладзіміру
Валяр'янавічу цяжка ўспамінаць. А вось ужо 2000-я гады сталі для творчасці аўтара самымі плённымі. Як паэт Уладзімір Валяр'янавіч праяўляецца ў поўнай меры.

З маладосці добра спявае, піша нават тэксты песен. Ігра на гітары дапамагае падбіраць музыку на гэтыя тэксты.

Не так даўно, а менавіта ў жніўні 2006 года, выходзіць з друку першы і пака адзіны зборнік вершаў Ул. Руля пад назвай "На зорных шалях вечнасці". Невялікі па памеру, але колькі ў ім сэнсу, пачуццяў, узрушанасці…

Вершы паэта вызначаюцца непадкупнай шчырасцю, філасофскай разважлівасцю, мудрасцю і светлымі адносінамі да адвечных ісцін жыцця: дабра, кахання, справядлівасці.

Зіма па сцяжыначках слізкіх
Сплывае вадой у нябыт,
Аддаўшы актэту вятрыскаў
Нябачную воку калыску,
У якой выспявае блакіт.

Блакіт жаўруковых нябёсаў
У сонечным зыркім агні
Цяплом зрушыць сок у бярозах
Назло сакавіцкім марозам,
Якія яшчэ ў вышыні,

І тут: на зямлі гаспадараць,
Трымаючы флору ў сне;
Караюць запозненай карай
Мае спадзяванні і мары,
Што мкнуцца насустрач вясне.

Яна ўвесь прасцяг разняволіць
Ад бела-халодных снягоў,
Разбудзіць пупышкі на голлі,
Пакліча аратых у поле,
Пяшчотай кахання натоліць
Настрой паэтычных радкоў! *(2005 г.)*

Якое гэта шчасце – жыць на белым свеце, якое шчасце адчуваць еднасць з прыродай, быць там, дзе можна адпачыць душою і разумець, што гэта сапраўднае шчасце і яно нават не кожнаму дадзена.

Як аддана любіць паэт сваю Радзіму, Бацькаўшчыну. Гэта заўсёды адчуваецца ў яго вершах. А вершы – гэта музыка душы паэта, яго самыя шчырыя пачуцці.

Родны край! Замірае душа,
Як убачу цябе на світанні!
Людзі раяць мне з’ехаць спярша…
Не хачу. Ды й не трэба растання!

Што рабіць мне ў замежжы, скажы,
Без прыцішанай матчынай мовы?
Будуць плакаць па мне капяжы,
Замаркоціцца ранак барвовы…

Без спагадлівых жончыных рук
На чужыне, відаць, як без волі.
Ды й малодшы сынок, мой жаўрук,
Не даруе ад'езду ніколі.

Не, не буду я вас пакідаць
Дарагія рачулкі і нівы, -
Лепей сілы Айчыне аддаць!
Я змагу і тым буду шчаслівы. *(2000 г.)*

Паэты і пісьменнікі – гэта сумненне кожнай нацыі. Яны гавораць нам, як мы павінны шанаваць і берагчы тое, што нас суправаджае ад калыскі і да скону дзён: гэта любоў да Радзімы і да матчынай мовы. Што чакае наша грамадства, калі зусім знікне родная мова? Мы не будзем тады нацыяй, мы будзем проста людзьмі, якія жывуць на пэўнай тэрыторыі. Тым мы і адметны ў свеце, што ў нас ёсць свая мова, свае звычаі і традыцыі.

Не выклікае ў мяне здзіўлення
Факт-сведчанне былых гадоў:
Аднойчы параўналі сотні моў
Па прыгажосці гучнага маўлення

І паліглоткі-докі больш за ўсіх
Над тым пашчыравалі адмыслова,
Каб вольны быў вердыкт ад скаргаў
злых,
Каб не рабіць аналізы нанова…

Дык вось што нам, спадарства, варта
знаць:

Ля італьянскай спеўнай мовы злева
Змагла на п’едэстал вышэзны стаць
І наша мова – віцэ-каралева!  *(2003 г.)*

Так шчыра, палка гаворыць паэт і аб сваіх адносінах да мовы бацькоў.

Здабыткам найдаўнейшых дзён,
Надзвычай велічным, багатым,
Які дайшоў да нас без страты,
Стаў роднай мовы гожы плён

Яна ўзяла мяне ў палон –
Ператварыма будні ў святы,
Не вымагаючы аплаты
За меладычны срэбны звон!

Сваёй крынічнай чысцінёй
І мілагучнасцю сваёй
Яна праславілася ў свеце!
Хто ж скажа мне: з якой бяды
Яе мядовых слоў суквецці
Ў нас ціха гаснуць ад нуды? *(2003 г.)*

Стан душы паэта, яго думкі, учынкі – адметныя. Яго душа, як мембрана, адгукваецца на кожную падзею быцця. Сэрца паэта баліць за наша сённяшняе жыццё, ён разглядае свой час і сваё месца ў ім.

…Прызнаюся ў тым, што палову гадоў
Пражыў без акрэсленай мэты,
Як флюгер, залежны ад волі вятроў,
Нічым іншым больш не адметны…

…Але на чацвёртым дзесятку жыцця
Адкрылі мне вочы на тое,
Што быў з маладосці ачмураны я
Падобнай на праўду лухтою!

Затым небездоказна Богу скажу,

Што часу патраціў нямала,
Каб светлай надзеяй расплямiць душу
І ў сэрцы змянiць iдэалы,

Аб тым, як заўзята iмкнуся цяпер
Надаць сэнс сваймy iснаванню,
Як маючы права на дзейсны намер,
Прыспешваю нацкае ранне.

Нястомнаю працай змяняю штодня
Свядомасць дзесяткаў знаёмцаў,
А ў снах падаецца яскрава, што я
Ўжо бачу свiтальнае сонца… *(2003 г.)*

У кожнай пары жыцця чалавека ёсць свая мера шчасця. Што значыць яно сёння для самога аўтара як мудрага чалавека і выдатнага паэта?

…А галоўнае – трэба штодзённа
Бласлаўленне матулi маёй
На змаганне з халодна-казённай
Шматаблiчнай, нядрэмнай хлуснёй.
*(2002 г.)*

Калі чалавек пражыў на свеце большую палову свайго жыцця, то ён павiнен нешта пакiнуць сваiм нашчадкам. Адзiн пакiдае багацце матэрыяльнае: цi то грошы, цi то маёмасць, другi нiчога не пакiдае, нават і добрай памяцi, а трэцi пакiдае духоўны скарб, духоўнае багацце і самае святое – сваю Радзiму.

“Служыць сваёй Айчыне не за страх,
Не за пасады, званнi, не за грошы,
Засейваючы велiчны прасцяг
Насеннем спраў-учынкаў чыстых,
гожых!”

*(2006 г.)*

У гэтай кнiзе паэт выказвае свае адносiны і да кахання, якое заўсёды дапамагае людзям жыць, а iншым часам нават i выжыць. Такiмi простымi словамi выказана гэта пачуццё і, мiж тым, так узнёсла, светла і прачулена.

Агорне сумненне падчас:
Прысніў я цябе ці ўбачыў?;
(За нешта мяне лёс якраз
Надзеяй на шчасце аддзячыў).
Успомніць няпроста цяпер
Ўсе рысы пяшчотнага твару,
Але, дарагая, павер:
З табою сустрэцца я мару,

Каб выказаць словы, якіх
Ніхто іншы сёння не варты;
Вер, шчырасць прызнанняў маіх
Не будзе падобнай на жарты.

Кожны чалавек павінен памятаць і аб сваёй малой Радзіме. Хоць наш аўтар нарадзіўся і вырас на Першамайскай зямлі, але , нажаль, у сваіх творах ён часцей за ўсё праслаўляе Воранаўскі край – "Радзіму Нарбутаў", тых людзей і тую мясцовасць, дзе ён пражывае.

…Воранаўскі край, ветразем лунай,
Хай жыве на лепшае надзея.
Светлы снежань грай,
Грай зялёны май –
Прыгажэе край і маладзее. *(2003 г.)*

Вядучую ролю ў зборніку вершаў Ул.Руля адыгрывае паэма "Мой род" – "аповяд доўгі пра Рулёў", дзе аўтар з любоўю і замілаваннем праслаўляе свой род, распавядае нам аб жыцці сваіх продкаў ад старажытнасці да сучаснасці.

"Прысвячаю сваім родзічам і сваякам: жывым і спачыўшым, блізкім і далёкім, добра вядомым мне і тым, памяць аб якіх захінула смуга часу.

Нас яднаюць агульныя карані, адна кроў. І не бяда, калі мы носім розныя прозвішчы. Гэта азначае тое, што наш род разгаліноўваецца, разрастаецца-ўмацоўваецца, што ён атрымаў Вышэйшы дазвол на існаванне сярод іншых паважаных родаў на зямлі маёй Бацькаўшчыны."

Зборнік паэзіі "На зорных шалях вечнасці" – гэта кніга

аднначасова светлая і сумная. Кніга, да якой хочацца звяртацца кожны раз: і калі табе балюча або сумна, і калі ў цябе на душы спакой ці радасць. Чытаючы гэтыя пранікнёныя радкі, кожны раз здзіўляешся і захапляешся талентам Паэта, шчырасцю Чалавека і адносінамі да жыцця Грамадзяніна.

**Заключэнне**

Паэты – тыя людзі, якія не адчуваюць свайго ўзросту. Пагэтаму, Уладзімір Валяр'янавіч паставіў для сябе задачу – выдаць яшчэ 5 зборнікаў сваіх вершаў. Да выдання ўжо падрыхтаваны арыгінальны багата ілюстраваны паэтычны зборнік "Пра Нарбутаў моўлю я слова".

Пачынаючы з 2001 года Ул.Руль працуе над вырашэннем праблемы годнага ўшанавання слынных постацяў у беларускай, літоўскай і польскай гісторыі: Тэадора, Людвіка, Станіслава Остык-Нарбутаў, Вандаліна Шукевіча і Пятра Врублеўскага на іхняй гістарычнай радзіме – сучасным Нацкім сельсавеце Воранаўскага раёна. Гэта ідэя стала сапраўдным сэнсам жыцця аўтара, якая дапаможа яму заявіць пра сябе, зрабіць сваё імя больш гучным.

Вершы і артыкулы Уладзіміра Руля, пачынаючы з 2000 года, друкуюцца ў мясцовых і рэспубліканскіх выданнях. Ён лаўрэат конкурсу "Серебряные строки", праведзенага газетай "Белорусская нива" у 2004 годзе. З 2007 года з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Приложение 3**

## Каляндар народных свят першамайскага краю

***КУЦЦЯ*** (6 студзеня)– пярэдадзень Каляд. Назва паходзіць ад абрадавай стравы – кашы ячных, радзей ячменных зярнят, вядомай усім славянскім народам. Гэта вячэра (вялікая Куцця) спраўлялася вельмі ўрачыста, стравы абавязкова былі поснымі, нескаромнымі. Звараная ўдзень каша стаяла ў гаршку на покуці, самым пачэсным месцы сялянскай хаты, рэшткі яе пасля трапезы сімвалічна пакідалі продкам. Акрамя вылікай Куццю спраўлялі перад Новым годам па старому стылю (шчодрую, скаромную) і

напярэдадні Вадохрышча (таксама посную). Спажывалася каша з сытою ці алеем. На Куццю гадалі, варажылі.
Прыкметы: На Куццю неба зорнае – будзе багаты прыплод жывёлы, ураджай на ягады.
У беларусаў-католікаў Тры каралі, Вадохрышча.
***КАЛЯДЫ*** (7 студзеня) – першае зімовае свята беларусаў і іншых народаў у гадавым крузе старажытнай земляробчай абраднасці. Калядавалі каля двух тыдняў. Звездары насілі на вуліцы звязду – сімвал Сонца, моладзь з пераапранутымі ў “казу”, “мядзведзя”, “жорава” аднавяскоўцамі хадзілі па хатах. Віншавалі гаспадароў, спявалі жартоўныя песні, частаваліся. Наладжвалі варажбу, розныя забавы і гульні: “Яшчара”, “Жаніцьбу Цярэшкі” і інш. Калядны рытуал даўней меў магічны сэнс, быў цесна звязаны з жыццём прыроды, яе чакаемым абуджэннем. З цягам часу свята набыло характар забавы моладзі.
Прыкметы: На Раство завіруха – будуць добра роіцца пчолы. Шэрань на дрэвах – ураджай на хлеб. На Каляды нельга шыць. “святое Раство – людзям прыгаство”.
***МАЛАДЗЁНЫ***, або Бабіны кашы (8 студзеня) – калядны дзень гасцявання ў бабуль.
Прыкметы: Ясны дзень – да добрага ўраджаю проса, пахмурны – на недарод яго.
***СЦЯПАН*** (9 студзеня) – дзень найму парабкаў, слуг. (“На святога Сцяпана вышэй слуга за пана”).
***ШЧОДРАЯ***, або багатая Куцця, шчадрэц (13 студзеня) – даўні звычай у беларусаў святкаваць вечар напярэдадні “старога” Новага года. Гатавалі кашу, бліны з верашчакай і смажанай каўбасою, крупнік з парасяцінай, буракі. Наладжвалі шчадраванне – вясёлыя забавы, гульні: хадзілі пераапранутымі па хатах, дзе жартавалі, спявалі, танцавалі, добра частаваліся. Увечары варажылі. На Палессі спраўлялі Куготы – рытуальныя абрады каля калодзежаў.
***ЗАВЯРШЭННЕ КАЛЯД***, шчодрага тыдня (18 студзеня). Трэцяя, галодная, вадапосная Куцця, Вадзянка.

***ВАДОХРЫШЧА*** (19 студзеня) – апошняе каляднае свята. У гэты дзень у царквах адбываецца асвячэнне вады, яна лічылася цудадзейнай. Звычайна на свята прыпадаюць самыя моцныя маразы, пасля якіх Сонца паварочвае на лета.

Прыкметы: На вадохрышча яснае і марознае надвор'е – да засушлівага лета. Хмарна і снежна – на добры ўраджай. "Дзень цёплы – хлеб цёмны (густы)". Зорная ноч на вадохрышча – будзе шмат ягад.

***ТАЦЦЯНА*** (25 студзеня) – звычайна бывае мароз. Дзень сонечны – рана прыляцяць птушкі з выраю, калі ідзе снег – лета будзе дажджлівае.\

***АПАНАС-ГУСЕЎНІК*** (31 студзеня)– дзень жывёлы, у некаторых мясцінах Беларусі яго адзначалі як гусінае свята. "Хавай нос у апанасаўскі мароз". У поўдзень сонца – вясна будзе ранняя.

***ГРАМНІЦЫ***, Срэценне (2 лютага) у беларусаў-католікаў. ("На Срэценне зіма з летам сустракаюцца").

***АКСІННЯ*** (6 лютага). Дзень Аксінні-паўзімніцы лічыўся пераломам зімы. Па стану надвор'я меркавалі пра вясну: "Якая Аксіння – такая і вясна". "Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце".

***ПЯРЭДАДЗЕНЬ ГРАМНІЦ*** (14 лютага) – грамнічны бацька. Рыхтавалі свечкі для асвячэння ў царкве. "Зорнае неба на Трыфана – позняя вясна".

***ГРАМНІЦЫ***, ***СТРЭЧАННЕ*** (15 лютага) – земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Па стану надвор'я ў гэты дзень меркавалі пра надыходзячыя вясну і лета: якое надвор'е такая і вясна. Калі на Грамніцы вялікі мароз, то снег паляжыць нядоўга, а лета будзе пагоднае і сухое; мяцеліца – вясна доўгая; цёпла – вясна ранняя, а лета непагоднае і неўраджайнае. "На Стрэчанне сняжок – вясной дажджок". "капеж на Грамніцы – ураджай на пшаніцу".

Асноўным рытуалам на Грамніцы было асвячэнне ў царкве свечак. Пасля свята сяляне пачыналі рыхтавацца да веснавых работ.

***МАСЛЕНКА*** – пачатак масленачнага, сырнага тыдня. У некаторых мясцінах Беларусі ў гэты час пачыналі "гукаць вясну".

***<u>АЎЛАС, УЛАС</u>*** – прысвятак у гонар язычніцкага усходнеславянскага бажаства Вялеса (Воласа), прымеркаваны да дня пакутніка Уласія. Дзень шанавання хатняй жывёлы. Каровіна і конскае свята. У вёсках аб’язджалі маладых коней, на рабочых не працавалі. Гаспадыні пяклі аладкі. Аўлас часта супадаў з Масленіцай, таму гаварылі: “На Аўласа бяры каўшом масла”.

<u>Прыкметы:</u> “Прыйшоў Прохар і Улас – скора вясна ў нас”. Ласі скідаюць рогі.

***<u>МАСЛЕНІЦА</u>*** – старажытнае перадвеснавое свята ў славянскіх народаў, звязанае з провадамі зімы і адраджэннем пладаносных сіл зямлі. Святкавалі яе некалькі дзён з абавязковымі блінамі, вясёлымі песнямі і гульнямі, катаннем на санках. Выконваліся абрады, якія павінны былі паскорыць абуджэнне прыроды, магічна садзейнічаць будучаму ўраджаю, дастатку селяніна.. Спальвалі чучала зімы, палілі вогнішчы, вадзілі карагоды, спявалі масленічныя песні. На Беларусі былі таксама пашыраны абрады вітання маладых, гульні халастой моладзі. У вёсцы масленіца звычайна пачыналася ў чацверг. Царква прымеркавала яе на нядзелю перад Вялікім постам.

Традыцыі масленіцы захаваліся і цяпер у святкаванні провадаў зімы.

***<u>НЯДЗЕЛЯ СЫРАПУСНАЯ</u>*** (28 лютага). Развітваліся з Масленіцай. У некаторых мясцовасцях Беларусі пасля абеду спальвалі яе саламянае чучала-ляльку. Загавіны на Вялікі пост.

***<u>ПАЎРАЦЕННЕ, АБЕРТАС</u>*** (9 сакавіка) – час звароту птушак дадому, завівання імі гнёздаў, прымеркаваны да дня знаходжання (обретения) галавы Іаана Прадцечы.

У беларусаў-католікаў дзень Сарака мучанікаў.

***<u>“АЎДАКЕЯ”, “ЯЎДОКА”</u>*** (14 сакавіка) – прысвятак у народным календары, прымеркаваны царквой да дня хрысціянскай пакутніцы. У некаторых мясцовасцях лічыўся канцом зімы, пачыналі гуканне вясны – старыжытны абрад святкавання абуджэння прыроды са спяваннем веснавых песень, пакланеннем расліннасці, Сонцу.

<u>Прыкметы:</u> Якая Аўдакея” такое і лета: цёплы вецер – мокрае лета; вецер з поўначы – да лета халоднага. Дождж – ураджай на

жыта. Дзень ясны – ураджай на агуркі і грузды. “Як на Аўдакею курыца вады нап’ецца, то на Ягор’я (6 мая) авечка травы наесца”. Сеюць капусту на расаду.

На ***ГЕРАСІМА***-грачэўніка (17 сакавіка) прылятаюць гракі. Калі яны адразу садзяцца на гнёзды, то вясна чакаецца дружнай.

***САРАКІ*** (22 сакавіка) – веснавое свята земляроба, у праваслаўі дзень 40 пакутнікаў. Чакалі прылёту птушак (жаваранкаў), “адпушчэння” дрэў. “Зіма канчаецца – вясна пачынаецца”. Калі ад Грамніц да Саракоў трымалася добрае надвор’е, то ўлетку чакалі засуху.

***РЫГОРА*** (25 сакавіка). “На Рыгора зіма ідзе ў мора”. Калі на Феафана туман – бедзе ўраджай на лён і канаплю.

У беларусаў-католікаў Звеставанне, Дабравешчанне (“У каго хлеба шмат – і Дабравешчанню рад”).

***БЛАГАВЕШЧАННЕ, ЗВЕСТАВАННЕ*** – веснавое хрысціянскае свята. У беларусаў Благавешчанне лічылася днём прыходу вясны. У вёсках пачыналі гуканне вясны – старажытны абрад сустрэчы цяпла. Моладзь выходзіла на высокія месцы, раскладвалі вогнішчы, пускалі агні па вадзе. Спявалі вяснянкі, вадзілі карагоды, закопвалі гаршчок кашы – прыносілі ахвяру зямлі. Гаспадыні пяклі з мукі галёпы ў выглядзе птушак. Гушкаліся на арэлях, абыходзілі з віншаваннямі двары. Са святам было звязана шмат павер’яў і забарон, не дазвалялася працаваць: “На Благавешчанне дзеўка касу не пляце, птушка гнязда не ў’е”.

Прыкметы: На Благавешчанне дождж – ураджай на жыта, грыбное лета; снег – лета мокрае. Сухое, цёплае надвор’е – лета засушлівае, а восень марозная.

Дабравешчаннiко святое,
Пашлі сонейка залатое,
Каб зямелька адышла
Ды вясна да нас прыйшла,
Каб распусціліся ветачкі,
Каб раскраснеліся кветачкі,
Каб лугі зазелянеліся,
Нашы нівачкі адзеліся.

***ВЕРБНІЦА, ВЕРБНАЯ НЯДЗЕЛЯ*** – апошняя нядзеля перад Вялікаднем. Паўсюдна асвячалі ў царкве галінкі вярбы, якім надавалі магічныя ўласцівасці: упрыгожвалі хаты, клалі на магілкі, выганялі імі на першы выпас жывёлу. На вербным тыдні чакаліся апошнія маразы-вербічы.

Вярба б’е – не я б’ю,
За тыдзень – вялікдзень.
Хвора ў лес, на верас,
А здароўе ў косці.
Будзь здароў, як вада,
А расці, як вярба.
Будзь здароў на ўвесь год,
Будзь так весел, як вясна,
Будзь так моцны, як зіма.

Не будзь санлівы,
Да работы лянівы,
Не будзь завіслівы.
Але будзь здароў, як вада!
расці, як вярба!
Будзь шмыткі, як пчала!
будзь багат, як зямля!
ад року да року
Вярбою па боку.

***АПОШНІ ЧАЦВЕРГ ПЕРАД ВЯЛІКАДНЕМ – ЧЫСТЫ.*** У гэты дзень сяляне прыбіралі ў хатах, чысцілі жывёлу, мыліся ў лазні. З чыстым чацвяргом было звязана шмат разнастайных павер’яў, рабілі прагнозы на будучы ўраджай. Работы на поле і ў агародзе не спыняліся, пасеянае ў гэты дзень абяцала быць чыстым і здаровым, урадлівым.

***ВЯЛІКДЗЕНЬ, ПАСКА*** – галоўнае хрысціянскае свята ўваскрасення распятага Хрыста. Вясновае свята старажытных славян у гонар Сонца, абуджэння прыроды, надыходу “вялікіх дзён” палявых работ. Адзначалі яго як самае радаснае ў жыцці земляроба. Сустракалі на досквітку сонца, якое паводле павер’я “іграе” на ўсходзе. Гатавалі багата смачных страў – заканчваўся доўгі пост. Гулялі фарбаванымі яйкамі “ў біткі”. Даўней на Беларусі ў велікодныя дні хадзілі валачобнікі, спявалі валачобныя і велікодныя песні, вадзілі веснавыя карагоды.

***ВЯЛІКІ ПАНЯДЗЕЛАК*** – другі дзень Вялікадня.

***ВЯЛІКІ АЎТОРАК*** – трэці дзень Вялікадня (“першы дзень пірагі маюць, сярэдні дзень пагуляюць, а паследні дзень выпраўляюць”). “Дождж на Куліну – будзе добрая каліна”.

***ВЯЛІКАДНЕ МЁРТВЫХ, НАЎСКАЯ ПАСХА*** (чацверг) – дзень ушанавання памяці памерлых родзічаў на могілках у некаторых мясцінах беларускага Палесся.

***РАДАЎНІЦА*** – радуніцкія дзяды, “вялікдзень мёртвых” – веснавое свята ўсходніх славян, звязанае з ушанаваннем продкаў, дзень памінання памерлых. У праваслаўі прымеркавана да свята ўваскрэсення Хрыстовага. Абрад адбываўся на “правады”, у

аўторак паслявелікоднага тыдня. На радаўніцу кожная сям'я ішла памінаць родзічаў спачатку ў царкву, а потым на прыбраныя магілы блізкіх. Расцілалі на насыпе абрус, садзіліся наўкола і пачыналі памінальную трапезу, якая нагадвала старажытную язычніцкую трызну ("страву"). Крыху стравы і гарэлкі пакідалі "для мёртвых". У размовах успаміналі нябожчыкаў, часта гучалі галашэнні. Правяденне радаўніцы заканчвалася застоллем дома: "На радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а ў вечары скачуць". Свята трывала існуе і цяпер, бо ў славян душэўная патрэба жывых ушаноўваць памяць сваіх продкаў непадуладна часу.

***<u>ЮР'Я, ЮРАЙ, ЯГОРЫЙ</u>*** – старадаўняе свята беларусаў у гонар заступніка жывёлы і гаспадаркі Юрыя (Георгія), які ў часы хрысціянства замяніў язычніцкае славянскае бажаство вясенняй ўрадлівасці і плоднасці жанчын – Ярылу.

Раніцай сяляне ўрачыста выганялі статкі ў поле на цудадзейную "юр'еву расу". Напярэдадні выводзілі на першы начлег коней. На свята аглядалі нівы, абыходзілі палі з караваем. Адзначалі Юр'е і пастухі, яны наладжвалі на пашы абрадавы пачастунак. У вёсках адбывалася народнае прадстаўленне з лялькамі пад назвай "Ягорый". У Пасожжы выконвалі абрад пахавання "Стралы" (камянёў і каменных прылад), ён суправаджаўся карагодамі, песнямі, шэсцямі, гульнямі моладзі. На гродзеншчыне на Юр'я дзяўчаты хадзілі з песнямі, абыходзілі двары як на Вялікдзень.

<u>Прыкметы:</u> На Юр'я густы дождж – жыта ўродзіцца густое, буйнае, калі дождж толькі "крапіць", то лета будзе багатае на траву. "На Юр'я дождж – скату лёгкі год, а на грэчку нярод". "На Ягорыя мароз – будзе проса і авёс". Калі на Юр'я не будзе ні снегу ні дажджу, то лета будзе сухое, неўраджайнае. Калі вада ў рэчцы прыбывае да Юр'ева дня, то лета будзе гарачае, з дажджамі неўпару.

***<u>ІВАН</u>*** (21 мая) – Іван веснавы, Іван доўгі, Мікольнік – у даўнія часы прысвятак земляробаў Міколін бацька ("Міколін бацька із сявалачкі яр засяваець. Первая сяўба – белый гарошак, втарая сяўба – яра пшаніца"). "Не сей пшаніцы да паяўлення дубовага ліста". На доўгага Івана садзілі моркву, агуркі, рэдзьку.

***МІКОЛА – ВЕСНАВЫ*** – старадаўняе абрадавае свята, земляробчая ўрачыстасць, прымеркаванае пазней да дня Мікалая-цудатворца. Гэта час перадлецця, разгар цвіцення раслін. У народных уяўленнях Мікола – заступнік земляроба, які клапоціцца пра ўраджай, аглядае пасевы, папраўляе іх пасля зімы. Мікола і свята конюхаў, пастухоў у некаторых мясцінах Беларусі: “Па межах ходзя і ўсё родзя, і траву расціць, і скот пасціць”. Лічылася, што калі ў гэты дзень жывёла ў полі наесца дасыта, то будзе добрая трава летам.

Здаўна да ***УШЭСЦЯ*** (27 мая), Шосціка прымеркавалі беларускія земляробы, старажытны магічны веснавы абрад ваджэння і пахавання “стралы” або “сулы”. Найбольш пашыраны ён у Пасожжы. Удзельнікі рытуалу наладжвалі ваджэнне карагодаў, шэсці радамі (танок), гульні, качанне па полі, закопванне “стралы” на ярыне, каб давала жыццё ёй і інш. Лічылася, што “громныя стрэлкі” – каменныя тапары, молаты, коп’і, белямніты з’яўляюцца зброяй Перуна і скінуты з неба. Абавязковай была песня “Ой, пушчу стралу па ўсяму сялу…”. “Стралой” завяршаліся веснавыя каляндарна- земляробчыя святы.

Як пушчу стралу да й па ўсём сялу,  
Ой, ля-лёй, ой да каля горада.  
Да ўпала страла пасярод сяла,  
Да ўбіла страла добра маладца.  
Да й ляжыць цела, як папер бела,  
Ніхто к целечку не прыступіцца.  
Прыступілася Ганна Паўлаўна,  
Ўзяла целечка да й на ручанькі,  
Панесла цела да й да цэркаўкі.

***ПАХОМ*** (28 мая) – веснавы земляробчы прысвятак, прымеркаваны да дня прападобнага Пахомія. Лічыўся “агароднім святам”, у гэты дзень садзілі агуркі (“Сей агуркі на Пахом – будзеш насіць мяхом”).

***ТРАЕЦКІЯ*** (сёмушныя) ***ДЗЯДЫ***. У некаторых мясцовасцях на ўсходзе Беларусі спраўлялі радаўніцу.

Троёца, троёца, свята благародзіца,

Пасею жыта, да няхай зародзіць.
Пасею жыта, пасею пшаніцу.
Зарадзі, Божа, усяку пшаніцу.
Ўто зародзіцца, то для майго бацюхна,
Што не зародзіцца, то для майго свёкарка.
Саладок мялок, то для маёй матанькі.
А горка гарэлка, то для маёй свякоркі.

***СЁМУХА***, зялёны святкі, зелянец – старажытнае славянскае свята, прымеркаванае да праваслаўнага дня Святой Тройцы. Вытокі яе ў родавым грамадстве, у аснове абрадаў ляжыць культ зеляніны, продкаў, шлюбу. На Беларусі перад святам упрыгожвалі хаты і двары “маем” (галінамі і дрэўцамі), прыбіралі магілы родзічаў. Асвячалі ў царкве палявыя і лугавыя зёлкі. Збіраліся сваякі. У час свята ў некаторых мясцінах кумаваліся – устанаўлівалі сяброўскія адносіны, ладзілі гульні, карагоды, дзяўчаты вялі вянкі, завівалі бярозку. Спявалі сёмушныя песні. У вёсках спраўлялі ў гэты час шмат вяселляў. У свяце захаваліся многія рысы язычніцтва і земляробчага культу.

Ой ты, тройца, прасвятая багародзіца,
Да пасеем жыта, да няхай зародзіцца.
Пайду я таго жыта глядзеці,
Аж вывела перапёланька дзеці.
Ой, пайду я другі раз глядзеці,
Да забралі перапёлчыны дзеці.
Да бадай таму тры гады хварэці,
Хто забраў перапёлчыны дзеці.

***ПРАВАДНЫ, ГРАНЫ ТЫДЗЕНЬ, РУСАЛЬНІЦА***. Яшчэ і цяпер на Палессі, асабліва на Піншчыне, памятаюць і спраўляюць
У чацвер Траецкага тыдня (сухі чацвер) забаранялася працаваць, каб не было засухі. У некаторых мясцінах Беларусі (Палессе) – ***НАЎСКАЯ ТРОЙЦА, НАЎСКІ ЧАЦВЕР*** – дзень памінання прдкаў. Выконвалі абрад “аблівахі” – выклікання дажджу.

***КУПАЛЛЕ*** (6 ліпеня) – старажытная абрадавая ўрачыстасць, якая пад рознымі назвамі вядома ўсім славянам. Святкавалася ў гонар Сонца, росквіту расліннасці, збажыны. Пазней прымеркавана да дня Іаана Прадцечы, з’явілася здвоенае імя “Іван (Ян) Купала”.

Прыкматы. Ккалі на Іванаву ноч зорна, то будзе многа грыбоў. Вялікая раса – да ўраджаю агуркоў. "На Купалу пачынай касьбу, прайдзі хоць першы пракос".

Ішла Купалка сялом, сялом,
Закрыўшы вочы, пяром, пяром.
Дзеўкі Купалку не пазналі,
На вуліцу гуляць ні пазвалі.
"Хадзі Купалка на вуліцу!"
- Гуляйцк, дзеўкі, мне некалі:
Мне трэба жыта пільнаваць
Каб змяя жыта не ламала,
У кароў малако ні збірала.

***ПЯТРО, ПЯТРОК, ПЯТРА*** (12 ліпеня) – дзень апосталаў Пятра і Паўла. Да яго прымеркавана старажытнае летняе земляробчае свята славян, язычніцкая назва якога не збераглася. Гэта быў своеасаблівы працяг Купалля. У аснове свята ляжыць культ зяляніны, росквіту жыцця, шлюбу. У беларускім фальклоры Пятро – апякун хлеба і хлебаробаў. Спявалі пятроўскія песні, варажылі, пачыналі вадзіць пятроўскія карагоды, што працягваліся да Спаса. Моладзь кумавалася, адбываліся гульні, частаванні. Пятру папярэднічаў пост – Пятроўка.

Прыкматы. "Прыйшоў Пятрок – адшчыпнуў лісток". "Свята Пятро – у жыце ядро". Салавей і зязюля пяюць да пятра.

***АНДРЭЙ*** (17 ліпеня) – адзін з апекуноў земляробства ("Святы Андрэй за ўсіх мудрэй. Саху ладзіць, каня гладзіць").

***ПРАКОП*** (21 ліпеня). "Пракоп – бок прыпёк". "Як на Казанскую паспелі чарніцы – паспела і жыта". У некаторых мясцінах Беларусі ў дзень святкавання Казанскай іконы спраўлялі зажынкі – абрад пачатку жніва, першага снапа, заклікання добрага ўраджаю.

***ПРОКЛ*** (25 ліпеня). Прокл – вялікія росы. "на Прокла поле ад расы прамокла".

У беларусаў-католікаў Якуб. ("Які Якуб да поўдня, такая да снежня зіма").

***ІЛЛЯ, ІЛЬЯ*** (2 жніўня) – біблейскі прарок, вобраз якога зліўся з славянскім язычніцкім богам грому і маланкі Перуном. Ілля ў

даўніх вераваннях – распарадчык дажджоў, апякун земляробства, які прыходзіць з “новым хлебам”, абаронца ад нячыстай сілы. Свята Іллі азначае час жніва, канец лета, пачатак пахаладання, дажджоў, што адпавядае сезоннаму рытму прыроды (“Як быў Пятрок – апаў лісток, а прыйшоў Ілля – апалі два”. “Ілля – нарабіў гнілля”). З гэтага ж дня забаранялася купацца. Рабілі першую падрэзку пчаліных сотаў. Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам.

***ГАННА*** (7 жніўня). Жніво. “Барыс з Ганнай не гуляюць, святому Ілы памагаюць”. “Як на Ганну ранак халодны – будзе і зіма халодная”.

Першы спас, ***МЯДОВЫ, “СПАСАЎКА-ЛАСАЎКА, МАКАЎЕ*** (14 жніўня) – у праваслаўі дзень пакутнікаў Макавеяў, што пераклікаецца з словам “мак”. Свята маку. “Спас – халодныя росы”. Пчолы перастаюць насіць ношак. Шпакі і гракі збіраюцца ў чароды.

Спажын пост – пачатак пятнаццацідзённага Успенскага посту.

***СПАС, ІСПАС*** (19 жніўня) – старажытнае земляробчае свята часу выспявання садавіны і агародніны, што мяжуе з асеннім цыклам палявых работ (“Прыйшоў Спас – усяму час”). Асвячалі ў царкве плады і насенне. Наладжвалі ў гэты дзень кірмашы, прадавалі мёд, зеляніну, садавіну. Усе імкнуліся паласавацца новым ураджаем, бо старыя людзі да Спаса яблыкаў не елі. У некаторых мясцовасцях са Спаса пачыналі сяўбу азімых, капалі раннюю бульбу.

“Прыйшоў Спас – і лета ад нас”. Буслы рыхтуюцца ў вырай.

***ПРАЧЫСТАЯ, СПАЖА, УСПЛЕННЕ, ЗЁЛЬНАЯ*** (28 жніўня) – самае значнае свята земляроба канца лета. Гэта быў час ураджаю, падвядзення вынікаў працы селяніна (“Свята Прачыста – у полі ўрачыста”). Асвячалі ў царкве хлеб, зеляніну. Асвечанае жыта перамешвалі з насеннем, каб прычакаць на наступны год добрага ўраджаю. Сеялі азімыя (“Успенне – ці гатова насенне”). Разам з другой Прачыстай (Багачом) і Пакровамі Успеннем утварае Багародзіцкія святкі (“Прыйшлі святкі – апалі лісткі”).

Пачатак маладога “бабінага лета” (да 11 верасня).

Дзень пакутнікаў ***<u>ФЛОРА</u>*** і ***<u>ЛАЎРА</u>*** (31 жніўня) – "конскае свята" у земляробаў. Сяляне не працавалі ў гэты дзень на конях, не запрагалі, шанавалі іх. У некаторых мясцінах Беларусі – прысвятак пастухоў.

Пачынаюцца ранішнія прымаразкі-цепляки.

***<u>УСЯЧЭННЕ ГАЛАВЫ ІААНА ХРЫСЦІЦЕЛЯ</u>*** (11 верасня) – на Беларусі Іван Галавасек, Іван Посны, Калінавы Іван. У гэты дзень не елі скаромнага, не ўжывалі ў страву ўсё тое, што мела круглую форму. Стараліся нічога не сячы і не рэзаць, хлеб ламалі рукамі. Не рабілі ніякіх спраў на агародзе. На Палессі варылі кісель з каліны. "Іван Прадцеча гоніць птушку далеча".

***<u>БАГАЧ, БАГАТНІК, БАГАТУХА</u>*** (21 верасня) – старажытнае беларускае свята, што спраўлялі пасля заканчэння ўборкі ўраджаю, прымаркаванае пазней да дня нараджэння Божай Маці (другая Прачыстая). Важны момант у жыцці селяніна: у гэты час заканчвалі ворыва зябліва, сеялі азімыя ("Прыйшоў Багач – кідай рагач, бяры сявеньку – сей памаленьку"). Багач меў абшчынны характар, сімвалам свята была сявенька з зернем і васковай свечкай пасярэдзіне. З ёй абыходзілі двары, потым пакідалі ў хаце да наступнага ўраджаю.

З ***<u>УЗВІЖАННЕМ, ЗДЗВІЖАННЕМ</u>*** (27 верасня) святам ушанавання крыжа, на якім быў распяты Хрыстос, перапляталіся і даўнія народныя восеньскія вераванні. Да гэтага дня ўсё прыбіралася з поля. Адляталі ў цёплыя краі птушкі, спыняўся рост раслін. Было пашырана перакананне, што ключ ад лета знаходзіцца ў шызай галачкі, якая замыкала лета, адлятаючы ў вырай. Лічылася, ўто на Узвіжанне змеі "здзвігаюцца на зіму" ў норы, мядзведзі кладуцца ў бярлогі.

Дзень ***<u>ІААНА БАГАСЛОВА, БЛАГАСЛОЎ, ШАПТУН</u>*** (9 кастрычніка) – апошняя мяжа палявых работ селяніна ("Хто не дасее да Іаана Багаслова, той не варт добрага слова"). Зямля атрымлівае за свае дары нябеснае благавешчанне на спакой да вясны. Пачыналіся восеньскія сватанні і вяселлі ("Іван Багуслаў дружак разаслаў").

***ПАКРОЎ, ПАКРАВЫ, ПАКРОВА*** (пакрывала багародзіцы) (14 кастрычніка) – адначасова і старажытнае свята славян заканчэння восеньскіх і надыходу зімовых работ. Вазілі паліва. Пераводзілі жывёлу на стойлавае ўтрыманне. Пара вясковых вяселляў (“Пакровы пакрываюць траву лістам, ваду лёдамм, а дзяўчат шлюбным чэпкам”). Увечары перад святам дзяўчаты варажылі пра замужжа і сваіх суджаных. Пасля гэтага дня пачыналіся попрадкі 9вячоркі, супрадкі), якія працягваліся да Вялікадня.
Прыкметы. Які Пакроў па надвор’і – такая будзе і зіма. На Пакрова дождж – на наступны год пчолы збяруць многа мёду.
***ДЗЯДЫ, АСЯНІНЫ*** (30 кастрычніка) – памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў, які паходзіць ад славянскага язычніцкага звычаю трызны – памінальнай трапезы. Так называлі і дзень, калі адбываўся абрад.

Асяніны (Змітроўка, Радзіцельская субота) спаўлялася на трэцім тыдні пасля Пакроваў у суботу перад Змітравым днём. Падрыхтоўка да гэтага дня ўключала абавязковую ўборку і ўпарадкавання падвор’я і хаты. Гатавалі святочныя абрадавыя стравы. На вячэру заклікалі сваякоў, суседзяў. Паводле звычаю рэштків страў сімвалічна пакідалі “дзя дам”. Яны спраўляліся таксама перад масленіцай, на радаўніцу, сёмухай. Гэты абрад сведчыць аб высокай маральнасці земляробаў, павазе да сваіх продкаў.
“Да казанскай не зіма, пасля Казанскай – не восень”. У дзень святкавання (4 лістапада) ***іконы Казанскай Божай маці*** не выбіраліся ў далёкі шлях. Калі дождж на Казанскую – хутка зіма.
***ЮР’Я ЗІМОВЫ*** (9 снежня). “два Ягор’я ў гаду – адзін галодны, другі халодны”. Падстрыгалі грывы і хвасты коням.
***АНДРЭЙ, АНДРЭЙКІ*** (13 снежня) – дзень апостала Андрэя Першазванага – дзявочы прысвятак. Ён вызначаўся варажбой дзяўчат, якія “высявалі” насенне лёну, канапель каля калодзежа ці палонкі, а перад сном у пасцелі, кажучы:”Святы Андрэйю, канапелькі сею, дай мне знаць, з кім буду век каратаць”.

***<u>МІКОЛА-ЗІМОВЫ, МІКОЛЬШЧЫНА</u>*** (19 снежня). Па надвор'ю "ніводнаму Міколе не вер ніколі". Шэрань у гэты дзень – да ўраджайнага году.

***<u>ГАННА</u>*** (22 снежня). "На ганну сядайце на санкі". У дзень Ганны вызначалі надвор'е, якое будзе роўна праз паўгода ("па зіме і лета").

**Приложение 4**

# По следам творческой экспедиции «Память пылающих лет», посвящённой 65-летию Победы в Великой Отечественной войне

1. **Краткий исторический экскурс**




Белорусский народ - от мала до велика - поднялся на борьбу против оккупантов. 22 июня 1941 года фашистская Германия вероломно, без объявления войны напала на Советский Союз. И первый удар был нанесён по Беларуси. На борьбу с врагом встал весь наш народ. И среди них 150 жителей Первомайского сельского Совета.

Вся Беларусь покрылась концлагерями и тюрьмами. Фашисты сжигали советских людей, закапывали живыми в землю, вывозили в Германию. Они создавали для массового уничтожения людей настоящие комбинаты смерти. Фашистские захватчики провели более сотни карательных операций, во время которых целые районы превращались в «зоны пустыни».

За три года оккупации на территории Беларуси фашисты превратили в руины 209 городов, уничтожили 9200 сёл и деревень, расстреляли, повесили, замучили и сожгли свыше 2 млн. 200 тыс. советских граждан.

Среди деревень, судьбу которых в годы Великой Отечественной войны настигла судьба всем известной деревни Хатынь, находится и деревня Огородище нашего района.

Деревня Огородище, Первомайского сельского совета, является невозрожденной деревней. Она расположена в лесном массиве заказника «Котра», на правом берегу реки Котра. Сожжена немецко-фашистскими захватчиками в 1943 году 26 февраля, за связь местных жителей с партизанами. 500 гитлеровцев окружили деревню, прикладами и штыками согнали всех жителей в дом Матвея Саковича. Мужчинам приказали выкопать яму, затем начали выводить по 10 человек и подгонять к яме. Сначала стреляли из автоматов и пулемётов, а затем в яму бросили несколько гранат. Многие пробовали убегать, и куда же убежишь, если кругом пулемёты и далеко к лесу. Вражеские пули догнали тех, кто всё же решался спастись.



Таким образом, было сожжено 28 домов, 147 жителей. Рядом с рекой Котра стоит большой памятник с красной звездой наверху. На нём надпись «Тут похоронены 147 жителей д. Огородище, расстрелянных немецко-фашистскими оккупантами 26 февраля 1943 года». За центральным памятником находятся ещё 4, которые были поставлены родными и близкими жертв трагедии. Памятник был поставлен в 1962 году, а в 2001 году памятники и захоронения были координально реконструированы.

## 2. Материалы из школьного краеведческого музея



*60 гадоў трагедыі вёскі Агародзічa*

**БОЛЬ АБ ЗАГІНУЎШЫХ ЗАСТАЕЦЦА, ПЕРАДАЕЦЦА НОВЫМ ПАКАЛЕННЯМ**

**АДКРЫТЫ АДДЗЕЛ**

**КСЕРАКОПІЯ**



**ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ І СМУТКУ**

**ДАКРАНУЦЦА ДА ПАМЯЦІ БАЛЮЧА**

**БОЛЬ АБ ЗАГІНУЎШЫХ ЗАСТАЕЦЦА, ПЕРАДАЕЦЦА НОВЫМ ПАКАЛЕННЯМ**



Векапомнае

# ...ЧОРНЫ ДЗЕНЬ НЕ ЗАБЫЦЬ НІКОЛІ...

*На памятных плітах мемарыяльнага комплексу Хатынь ёсць назва і вёскі Агародзішча. 26 лютага – чорны дзень смутку, які будзіць нашу памяць, стукае ў сэрцы, уваходзіць у нашы сны. 65 год на месцы, дзе раней была вёска, – лес, ужо немалады, які доўжыць свой век без людзей. І помнічак каля рэчкі Хотра – цэлай вёсцы Агародзішча, як напамін аб страшэннай трагедыі.*



# Бераг цішыні

## 3. Воспоминания очевидцев



**Воспоминания Сакович Веры Ивановны,**
**бывшей жительницы этой деревни**

В этот день я находилась у своей сестры. В Огородище остались муж, маленькая дочь, 8 близких и родных для моей семьи людей.

Трагедия произошла в пятницу, а в понедельник пришла уже на пепелище. Передо мной открылась жудостная картина: на месте ещё недавно жившей деревни стояли только обгорелые трубы печей, а кругом была мёртвая тишина. В этот день забирали имущество, а из живых я увидела только собаку и петуха.

**Воспоминания Хилевской Марии Николаевны.**

…Утром мы увидели, что в Огородище что-то горит, подумали, что это смоляки. Но ошиблись. В деревне горел новый дом. Ещё дома мы услышали несколько выстрелов. Мы думали, что людей из деревни увезли, поэтому сами на следующий день уехали с хутора. Во время войны жили в Берштах, только здесь узнали, что всех жителей Огородища немцы расстреляли и сожгли. Когда окончилась война, мы вернулись домой. Дома ничего не нашли. Стоял только пустой дом и единственный стол.

## 4. Социально-значимая деятельность







### Запрашальны ліст

**Паважаныя сябры !**

Савет дружыны запрашае ўсіх вучняў школы (акцябрат, піянераў, членаў ГА"БРСМ") прыняць удзел у праекце **"Дарыце людзям радасць"** на працягу навучальнага года па напрамках:

**1. "Вайна пакінула свой след"(**шэфства над ветэранамі ВА вайны,
сем'ямі воінаў-інтэрнацыялістаў, вязняў канцлагера, супрацоўніцтва з імі).

**2. "Адзін, але не адзінокі"(**забота аб адзінокіх і састарэлых людзях, якія пражываюць у мікрараёне школы).

**3. "Школа застаецца ў сэрцы назаўсёды"(**сувязь з настаўнікамі-пенсіянерамі).

**4. "Памяць"(**догляд помнікаў, абеліскаў, брацкіх магіл, магіл аднавяскоўцаў, у якіх няма родных).

**5. "Працягні руку сяброўства"(**супрацоўніцтва з дзецьмі-інвалідамі, выхавальнікамі дзіцячага дома, дзецьмі з

малазабяспечаных і мнагадзетных сем'яў, дзецьмі, якія часта хварэюць).

**6. "Не сумуй, малыш"(**правядзенне КТС для падшэфных малодшых класаў, дзіцячага сада, выраб цацак, дыдактычнага матэрыялу).

**7. "Прырода – наш дом, ты гаспадар у ім"(** уборка тэрыторыі сквера, школы, беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя).

## Спіс
## ветэранаў ВА вайны,
## адзінокіх састарэлых людзей, пражываючых у зоне піянерскага дзеяння, і іх шэфаў

| № п\п | Прозвішча, імя падшэфнага | Адрас | Клас, кл. кіраўнік |
|---|---|---|---|
| 1. | Сярко Іван Фёдаравіч | в.Першамайская | 5 клас Іваноўская Т.А. |
| 2. | Янковіч Таццяна Яўгеньеўна | в.Першамайская | 6 клас Гудач Н.І. |
| 3. | Амялевіч Іосіф Вікенцьевіч<br>Астраповіч Ефімія Гаўрылаўна | в.Даўбенкі<br>в.Даўбенкі | 7 клас Шляхтун С.Г. |
| 4. | Місюкевіч Антон Іванавіч<br>Місюкевіч Уладзімір Паўлавіч | в.Куляшы<br>в.Куляшы | 8 клас Кладкевіч Н.Р. |
| 5. | Мірча Казімір Флер'янавіч<br>Мірча Леакадзія Іосіфаўна | в.Вензаўшчына<br>в.Вензаўшчына | 9 клас Бабрыцкая Т.І. |
| 6. | Сідлярэвіч Уладзімір Лаўрэнцьевіч | в.Вераб'і | 10"А" клас Гудач В.А. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7. | Лебядзевіч Любоў Іосіфаўна | в.Замасцяны | 10”Б” клас Лянгнер В.Т. |
| 8. | Глушань Іван Мікалаевіч<br><br>Дубінка Станіслава Аляксандраўна | в. Глушні<br><br>в.Першамайская | 11 клас Дубінка М.С. |

Помнік у скверы в.Першамайская – Піянерская дружына імя П.Марозава
Магіла сям’і Алясневіч в.Табалічы – 10 “А”клас
Магіла  Марозава в.Замасцяны – 10”Б”
Магіла Зыкава в.Першамайская – 5-6 клас
Магіла Будзько в.Першамайская – Савет музея



**Глушень**
**Иван Николаевич**



**Мисюкевич**
**Антон Иванович**



**Амелевич**

**Иосиф Викентьевич**



**Лебедевич**
**Иван Иванович**



**Ивановская**
**Валентина Викторовна**



**Дубинко**
**Станислава Александровна**




***Социально – значимая помощь ветерану Великой Отечественной войны  Серко Ивану Федоровичу.***

**Творческая мастерская при лагере “Улыбка”**
**конкурс детских рисунков и работ “Нам нужен мир”**




**Митинг в сквере 22 июня**



**Приложение 5**

# Беларускія вячоркі

**Мэта:** шырэй пазнаёміць выхаванцаў з народнымі гульнямі, песнямі, танцамі; засвоіць сінкрэтызм фальклорнай гульні: спевы, танец, тэатралізаванае дзеянне; паказаць праз сродкі фальклору адносіны нашых продкаў да жывёльнага і расліннага свету; выхоўваць любоў да беларускага фальклору.

**Гаспадар:** Жонка, жонка! Ну і мароз сёння! Дай хутчэй паесці, налівай кіслай ды гарачай капусты.

**Гаспадыня:** А каб цябе пранцы з'елі, даўно тут еў? І зноў есці, ясі ,ясі, ніяк не наясіся.

**Гаспадар:** Во жонку нажыў! І так усё жыццё. Працую, працую, як той вол, а слова ласкавага не пачую. Ёй усё грошы, грошы давай!

**Гаспадыня:** Ды змоўкнеш ты ці не? На, еш, хоць падавіся, ды хутчэй, а то хутка і госці да нас прыйдуць.*(стук у дзверы)*

**Гаспадыня:** Ну, вось і госці нашы ідуць. Праходзьце, сядайце калі ласка.

**Госці:** Добры вечар!

**Вядучы:** Добры вечар усім вам, дарагія госці... Дзякуем, што вы да нас завіталі... Рады мы ўбачыць вас у роднай хаце. Праходзьце, праходзьце калі ласка, сядайце зручней. Пасля нашага працоўнага дня прыйшла пара і адпачыць.

**Гаспадар:** Вы вось селі і адразу за працу. Заўсёды з пакон вякоў на вячорках спявалі беларускія народныя песні, гулялI ў розныя гульні. Дык можа і вы, мае каханенькія, родненькія, што-небудзь заспяваяце.

**Госці:** Добра, паспяваем. А што б вы хацелі паслухаць?

**Гаспадар:** Я некалі чуў такую песню "Зайграй жа мне, дударочку", калі вы яе ведаеце, дык паспявайце.

**Госці:** Добра, паспяваем!

*(песня "* Зайграй жа мне, дударочку *")*

**Гаспадар:** Добра, але ж мала. Каб вы мае, каханенькія, родненькія, здасца яшчэ што-небудзь праспявалі.

**Госці:** Давайце праспяваем *песню "Мікіта"*

**Гаспадар:** Дзякуй. дзякуй, дзяўчаткі, аж душа памаладзела.*(стук у дзверы)*

**Гаспадар:** Але ж пачакайце, нехта яшчэ спяшаецца да нас на вячоркі.*(заходзіць бабуля)*

**Гаспадыня:** Праходзьце, бабуля, вельмі прыемна, што вы да нас прыйшлі.

**Бабуля:** Добры вечар. А куды ж я гэта трапіла, можа туды, куды і збіралася?



**Гаспадыня:** Сюды, сюды.Праходзьце, бабуля, сядайце.

**Бабуля:** Я ж, мае вы родненькія, са сваім дзедам збіралася прыйсці да вас. Ды пакуль прыбіралася, спадніцу новую апранула, прыгожую блузку, хусціну завязала, то мой стары недзе прапаў.

**Гаспадар:** Не сумуйце, бабуля, знойдзецца ваш дзед, ён такі, што абавязкова завітае да нас.

**Бабуля:** Ну, тады добра. Буду чакаць яго ў вас. Вельмі мне тут у вас падабаецца. А вы ўсе такія прыгожыя, маладзенькія. Можа вы мне што- небудзь праспяваеце?

**Госці:** Добра, бабуля, мы вам праспяваем *песню "Саўка ды Грышка"*

**Бабуля:** Як прыемна было паслухаць. А ў мяне нешта ёсць і для вас. Дзе ж гэта мой кошык?*(Гаспадар падае кошык)*Але ж, мае даражэнькія, гэты кошык не просты, а чароўны, ён умее загадкі загадваць. А вы любіце адгадваць?

**Госці:** Любім.

**Бабуля:** Вось і добра, тады слухайце.

1. З гаспадаром сябруе. хату пільнуе, ляжыць пад ганкам, а хвост абаранкам. (сабака)
2. Даўгавухі і касы, скача без аглядкі ад ваўка і ад лісы, хто знайшоў адгадку? (заяц)
3. Вёрткі, рыжанькі звярок з галінкі на галінку скок ды скок. (вавёрка)
4. Набрала гарэхаў 5 мяхоў, набрала грыбоў 120 карабоў,

нацягала шышак горку працавітая ,.................. (вавёрка)

-Якія вы вясёлыя, разумныя!




**Гаспадар:** Госці, а ці не пара нам патанцавваць, нешта ногі самі ў пляс просяцца. *(танец "Із-пад дуба, дуба, дуба...")*

**Бабуля:** Ой, штосьці мой дзед не ідзе, а ён так любіць людзей, якія хораша танцуюць і спяваюць.

*(стук у дзверы)*

**Гаспадар:** Нехта ў дзверы стукаецца, мабыць гэта дзядуля да нас спяшаецца.*(выступленні малодшых класаў)*

**Гаспадар:** Добры вечар вам, праходзьце, сядайце і на нашых вячорках паспявайце: Ну, калі так, то давайце паспяваем прыпеўкі. *(спяваюць прыпеўкі) (дадатак 1)*

**Гаспадыня:** Дзякуй вам за вашы цудоўныя прыпеўкі. Мне здаецца, што ў нас сёння сабраліся вельмі добрыя і працавітыя людзі. Яны ўсё ўмеюць рабіць. А, вы, вышваць ды вязаць умееце? Умеем! *(паказваюць свае вырабы)*

**Гаспадыня:** Вось малайцы, але добра было б каб вы яшчэ нам праспявалі.*(спяваюць песню "Міхасёк гасцей збірае")*

**Гаспадыня:** А, што яшчэ вы нам можаце паказаць? (танец "Ой да каліна"*)(стук у дзверы)*

**Бабуля:** Ну, гэта ўжо, напэўна, мой дзед ідзе. *(уваходзіць дзед)*

**Дзед**: Добры вечар, даражэнькія мае, не спазніўся я да вас? Вось і добра. Дык вы ж гляньце і бабуля мая нават тут. Размінуліся мы хіба з табою? А я ж думаў, што ты не пойдзеш.

**Бабуля:** Дык я ўжо даўно тут, гэта вось ты больш за мяне збіраўся.

**Дзед:** Ну, нічога, я таксама не надта спазніўся.



**Бабуля:** Каб ты ведаў, якія яны тут вясёлыя, якія цудоўныя песні спяваюць.

**Дзед:** Добра, добра. Дык можа яны і мне праспяваюць якую-небудзь вясёлую песню?

**Гаспадар:** Абавязкова аспяваюць.

*(песня "Ой, ляцелі гусі з броду ")*

**Дзед:** Малайцы, песні вы добра спяваеце, а вось танцаваць спрытна ўмееце?



**Бабуля:** Ды што ты, дзед, яны ўсё могуць.

*(танец "Яблочко")*

**Дзед:** Праўду ты, баба, кажаш, яны ўсё ўмеюць.

**Госці:** *(просяць у дзеда расказаць што-небудзь)* (дзед расказвае)

**Дзед:** Ну як, спадабалася?

**Госці:** А мы зараз раскажам вам прыказкі і прымаўкі. Прыказкі і прымаўкі вельмі коратка і дакладна вучаць нас народнай мудрасці. Вось паслухайце:

1. Поле араць - не рукамі махаць.
2. Пасееш упору - збярэш зярна гору.
3. Што пасееш - то пажнеш.



**Бабуля:** Нешта я, дзед, надта змарылася. Пара нам і дамоў збірацца.

**Дзед:** Так, баба, мы з табой добра адпачылі, песні спявалі,

скакалі, а зараз пара і дадому. Да пабачэння ўсім вам!

**Гаспадыня:** Дзякуй вам. Вось як хутка час праляцеў, прыйшла пара і развітвацца, а на паследак хочацца сказаць:

Заходзьце, заходзьце часцей у хату,
Каб дом наш не ведаў ні гора, ні брані,
А сэрца было адкрыта шчырым сябрам,
Госцям дарагім і вам!!!

## Д А Д А Т А К 1

Мы частушек много знаем
И хороших и плохих
Хорошо тому послушать,
Кто не знает никаких.

Ставьте ушки на макушки
Слушайте внимательно
Мы сейчас споем частушки
Очень замечательно.

Чтобы печка разгорелась
Надо жару поддавать,
Чтоб частушка лучше пелась
Надо пляской помогать.

Разрешите поплясать,
Разрешите топнуть.
Неужели в этом доме
Половицы лопнут?

Здорово, здорово
У ворот Егорова
А у наших у ворот
Все идет наоборот.

А у нас во дворе
Квакали лягушки,
А я с печки босиком,

Думала - подружки.

По деревне я шла
И Ванюшу видела –
'Под кустом сидел и плакал:
Курица обидела.

Я плясала в три ноги
Потеряла сапоги
Оглянулася назад.
Сапоги мои лежат.

Говорят, я боевая,
Боевая, ну и что ж!
Моя мама боевая,
Ну, а я тогда в кого ж?

Если б не было воды,
Не было и кружки,
Если б не было девчат,
Кто бы пел частушки!

Не смотрите на меня –
Глазки поломаете
Я не с вашего села
Вы меня не знаете.

Пошла плясать бабушка Лукерья.
На затылке нет волос -
Привязала перья.

Мы частушки вам пропели
Хорошо ли, плохо ли?
А теперь мы вас попросим,
Чтоб вы нам похлопали.

**Приложение 6**

# ВУСНЫ ЧАСОПІС
# “НАШЫХ ДУШ КАРАНІ”

**МЭТА:** даць больш поўнае ўяўленне аб родных мясцінах, іх гісторыі, пазнаёміць вучняў са сваёй мясцовасцю, яе гісторыяй, звычаямі і традыцыямі; выхоўваць пачуцці любові да Радзімы, цікавасці да яе гістарычнага мінулага, духоўнай спадчыны народа.

**ЗАБЕСПЯЧЭННЕ:** фанаграма песні “Мой родны кут”, фотаздымкі, партрэты.

## ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА:

Гучыць песня на словы Я.Коласа “Мой родны кут”.

**1-ы чытальнік**

Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы самарослыя парасткі –
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані – з вузлякамі ўпартасці.

**2-і чытальнік**

Сокам вотчынных гоняў ад роду мы ўспоены,
Сонцам родных нябёс мы з маленства аблашчаны,
Як асілкі дубы над дняпроўскімі поймамі –
Паяднаныя часам нашчадкі і прашчуры.

**3-і чытальнік**

Гэтай повязі кроўнай, якой мы прывязаны
Да бацькоўскай зямлі, - не парвуць, не растурзаюць
Аніякія буры – вятры непрыязныя, -
Нашы сэрцы ад іх яшчэ больш загартуюцца.

**Вядучы:** Рака нараджаецца з ручаін, дрэва расце з каранёў, чалавечая годнасць і вартасць нараджаюцца з глыбокай адданасці сваёй Радзіме, з ведання яе гісторыі, з пашаны да спадчыны, з любві да матчынай мовы.

Сёння мы з вамі паспрабуем сваімі сіламі стварыць старонкі вуснага часопіса “Нашых душ карані” і расказаць пра мінуўшыну і сучаснасць нашага Першамайскага куточка. Эпіграфам да часопіса мы ўзялі словы Я. Купалы. Кожная група працавала над сваімі заданнямі.

Прадстаўляем групы: “Скарынічы”, “Крывічы”, “Нашчадкі”.

Адкрываем першую старонку часопіса **“Гісторыя роднай вёскі”.** Гэтую старонку часопіса прадстаўляе група “Скарынічы”.

**1.З гісторыі вёскі.**

Ужо стала забывацца хваля патрэбных і непатрэбных пераіменаванняў населеных пунктаў, што праводзілася па рэспубліках былога Савецкага Саюза некалькі гадоў назад. На шчасце , на Беларусі яна не набыла вялікіх маштабаў, тым больш, што на Шчучыншчыне існуе вёска, якая па колькасці сваіх “імёнаў” можа звесці з розуму любога прыхільніка “аднаўлення гістарычных назваў”. Гаворка ідзе пра вёску Першамайская, цэнтр аднаіменнага сельскага Савета.

Паводле вядомага гісторыка і краязнаўцы Н.Роўбы, сучасная в. Першамайская вядома з 15 ст. Тады яна называлася Забалацце. Назва гэта вельмі доўга адлюстроўвала прыродныя ўмовы тагачаснага наваколля, але стварала шмат блытаніны. Справа ў тым, што таконімы Забалаць, Забалацце вельмі распаўсюджаны на Беларусі. Так, у Шчучынскім раёне на сённяшні дзень існуюць в. Забалаць у Мажэйкаўскім і Забалацце ў Навадворскім сельскім Саветах. Мала таго – у 10 кіламетрах ад старажытнай Забацці, знаходзілася мястэчка Забалаць сучаснага Воранаўскага раёна. Таму калі ў 1550 годзе в.Забалацце была перададзена перабежчыку з Масквы баярыну Міхаілу Сабакіну, то мясцовае насельніцтва пачало называць вёску Сабакінцамі, ад прозвішча новага ўладальніка. Аднак ёсць і другое сцвярджэнне. Па паданню, калісці тут адпачываў кароль, які прыязджаў на паляванне. Таму і назва мястэчка Сабакінцы прыйшла ад быўшай тут каралеўскай псарні. Пад назвай Сабакінцы вёска праіснавала больш за 300 гадоў і нават нейкі час лічылася мястэчкам. Але ў другой палове 18 стагоддзе “грубая мужыцкая назва” Сабакінцы

пачала дрэнна ўспрымацца далікатным шляхецкім вухам. На гэта паўплывала тагачаснае панскае захапленне антычнай культурай ды французскім асветніцтвам. Каб надаць Сабакінцам больш прыстойнае гучанне шляхта пачала ўжываць у 18 ст. новую форму – Собокінцы. Але ж сяляне не зразумелі панскай мілагучнасці ды прытрымліваліся ўласцівай беларускай мове фанетыкі – Сабакінцы.

У 60-ых гадах 19 ст. з боку праваслаўных святароў з’явілася прапанова пераіменаваць Сабакінцы ў сяло Пакроўскае ці проста Пакровы, ад назвы тутэйшай царквы Пакрова Прысвятой Багародзіцы. Ідэя гэта абмяркоўвалася амаль 30 гадоў, на працягу якіх мястэчка называлася то Сабакінцамі, то Пакроўскім. У рэшце рэшт 13 верасня 1899 года губернскае праўленне ў Вільні канчаткова зацвердзіла новую назву – Пакроўскае. Не паспела насельніцтва да яе прызвычаецца, як пачаліся войны, рэвалюцыі ды паўстанні 1914 – 1920 гадоў, у выніку якіх Шчучыншчына стала часткай Польскага княства. Новыя ўлады адразу адмовіліся ад назвы Пакроўскае, якая нагадвала аб сумных часах падзелаў Рэчы Паспалітай і вярнуліся да старой – Сабакінцы. Але хутка польскім чыноўнікам таксама не прыйшлася даспадобы гэтая назва. Неўзабаве ў сярэдзіне 30-х гадоў 20 ст. з’явіўся праект пераіменавання Сабакінцаў у Нарбутова – у гонар аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 – 1864 гг. Людвіга Нарбута. Пасля палемікі ў друку 2 ліпеня 1939 года прайшла афіцыйная ўрачыстасць у гонар надання мястэчку новай назвы – Нарбутова. Але не паспела высахнуць фарба на новых шыльдах, як у верасні 1939 года ўспыхнула Другая сусветная вайна, першай ахвярай якой стала Польшча. І трох месяцаў не пабыўшы Нарбутовым, мястэчка зноў стала называцца Сабакінцамі. Пад гэтай назвай яно перажыло цяжкія гады ваеннага ліхалецця.

У 1944 годзе на Шчучыншчыну канчаткова прыйшла Савецкая ўлада. На пачатку 1950-ых гадоў, пасля аднаўлення гаспадаркі, калектывізацыі і знішчэння так званых “бандаў”, і новае кіраўніцтва звярнула ўвагу на нязручную назву аднаго з раённых сельскіх Саветаў – Сабакінскі. Каб неадкладна вырашыць гэтае пытанне ў 1954 г. вёску Сабакінцы пераіменавалі

ў Першамайскую, а мясцовы сельскі Савет стаў Першамайскім. Новыя назвы былі мілагучнымі і “яскрава савецкімі”. Так на сённяшні дзень і існуе добра ўсім вядомая вёска Першамайская.

Такім чынам, на працягу сваёй 500-гадовай гісторыі сучасная вёска Першамайская змяніла 6 назваў: Забалацце, Сабакінцы, Собокінцы, Пакроўскае, Нарбутова, Першамайская. Дарэчы, гэта своеасаблівае дасягненне, так што, Першамайскі сельскі Савет можа смела звярнуцца ў славутую кнігу рэкордаў Гінэса. Хто ведае, можа ганаровая старонка там будзе забяспечана. Няхай ведаюць нашых.

**Вядучы:** Другая старонка журнала “Наша школа ўчора і сёння” (гучыць “Школьны вальс”). Прадстаўляе група “Крывічы”.

Гісторыя нашай школы пачыналася так.

**1.Будаўніцтва школы.**

На месцы, дзе зараз знаходзіцца школа, раней было поле, якое належыла падпалкоўніку царскай арміі Сабакіну. У 1864 годзе пры Сабакінскай царкве было адкрыта народнае вучылішча. З 1920 па 1939 гг. у Сабакінцах як раз пад час акупацыі Беларусі палякамі дзейнічае польская школа. У 1939 годзе адчыняецца Сабакінская сямігадовая школа. У 1944 годзе пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гэта школа была адноўлена. У 1950 г. Сабакінская сямігадовая школаператворана ў сярэднюю. Першы яе выпуск адбыўся ў 1953 годзе з 7 вучняў. У 1954 годзе гэта школа пераіменавалася ў Першамайскую. У гэты час сцены школы ўзводзіліся ўжо з цэглы, дах крылі шыферам. Потым клалі падлогу і рабілі столь. Школа ў той час некалькі разоў мяняла сваё месца. Спачатку яна размяшчалася ў будынку сучаснага быткамбіната, затым у школе- інтэрнаце, пазней пару класаў былі у будынку сучаснага музея.

**2.Адкрыццё школы.**

У 1974 годзе пабудованы новы будынак школы. Узнялася двухпавярховая пабудова на 500 чалавек. Кабінетаў было вельмі шмат, светлыя і прасторныя класы. Тагачасным вучням нецярпелася хутчэй займацца ў новым памяшканні і яны дружна прымалдi ўдзел у яе будаўніцтве. Дапамагалі будаўнікам насіць пясок, мяшаць цымент і іншае.

1 верасня 1974 года новы будынак школы прыняў сваіх навучэнцаў. Адкрыццё новага будынка стала сапраўдным святам для ўсёй вёскі. Быў наладжаны святочны канцэрт.
Першамайскай сярэдняй школай зроблена 35 выпускаў – гэта 1230 выпускнікоў.

У гэтым навучальным годзе ўшколе займаецца 115 вучняў і 17 выхаванцаў дзіцячага садка. У распараджэнні вучняў 19 светлых і прыгожых кабінетаў. Усе вучні забяспечаны падручнікамі і гарачым харчаваннем. Школьны двор прыгожа дэкарыраваны рознымі фігурамі, клумбамі. Заўсёды чысты і ўтульны.

Гучыць музыка "Авэ Марыя".

**Вядучы:** Наступная старонка часопіса - **"Касцёл – гісторыка-архітэктурны помнік нашага краю"**. Прадстаўляе гэту старонку група "Нашчадкі".

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых мілых берагоў…

Сквозь вяночкі дрэў вясёла
Над мястэчкам ці сялом
Цэрквы, стромкія касцёлы
Вежы ўзносяць к небысом.

А званіцы перад святам
У касцёл, царкву завуць,
Каб "прад Богам і прад братам
Віны ўсе свае пачуць"                Я.Колас.

**Вучань:**

**1.Легенда аб паходжанні касцёла"Уздзвіжэнне Крыжа"**

Пачалося будаўніцтва касцёла ў 1935годзе на ахвяры прыхажан пад кіраўніцтвам ксяндза Адольфа Гродзіса. Ён,

ходзячы па Калядзе, збіраў у людзей як багатых так і бедных розныя рэчы, прадметы. Затым учыняў беспройгрышныя латарэі, такім чынам капіў сродкі на будаўніцтва касцёла, якое і так працягнулася амаль што на пяць гадоў.

Ксёндз Гродзіс быў пахаваны на тэрыторыі касцёла. У 1989-1990г. астанкі яго былі перазахаваны на мясцовых каталіцкіх могілках.

Учас вайны касцёл таксама актыўна дзейнічаў. Менавіта, прыкладна, ў гэты час у касцёл быў прывезены з Германіі арган., які ў 70-х гадах быў разбіты адным мясцовы жыхаром-антыхрыстам. У савецкія часы, прыкладна ў 50-60-х гадах, спыніў сваю дзейнасць па свайму прамому назначэнню. Будынак доўгі час выкарыстоўваўся як склад для хімікатаў, запчастак для сяльгастэхнікі. Затым доўгі час будынак пуставаў, знаходзіўся ў непрыглядным выглядзе.

**2.Новае жыццё касцёла**

У 1989-1990 гадах пачалося актыўнае аднаўленне будынка касцёла, а ў 1990годзе адбылося ўрачыстае адкрыццё будынка як каталіцкага храма, які і па сённяшні дзень дзейнічае. У касцёле знаходзіцца старажытны абраз Святога Юрыя (канец XIX-пачатак XX ст.ст), які размешчаны ў правым бакавым алтары і які быў прывезены з Новага Двара, дзе знаходзіўся доўгі час на сховішчы. Адна спавядніца храма была падаравана ксяндзом Міхалам з Дубіч (Літва), які, дарэчы, і стаў ініцыятарам аднаўлення і адбудавання Першамайскага касцёла.

Першым ксяндзом у новым храме стаў Тадэвуш Крыштопік, які адпрцаваў тут 6 гадоў. Пры яго дапамозе былі прывезены з Барысава 2 званы. На якіх выгравераваны прозвішчы кн. Міхаіла з Дубіч і Казіміра Запасніка – мясцовага захрысціяна, які ўнёс вялікі ўклад ў аднаўленне храма. На ахвяраванне кн.Тадэвуша быў напісаны абраз “Езу уфам Тобе”, які знаходзіцца сёння ў левым бакавым алтары касцёла.

Табернакулюм (месца для захавання Чашы для Прычасція) быў зроблены мясцовым майстрам з в.Паддубы Навагродскім. Кн.Тадэвуш пачаў таксама і будаўніцтва плебаніі (дом для святара).

Пасля ксяндза Тадэвуша Крыштопіка храмам і прыхажанамі кіраваў ксёндз Анатолій Маркоўскі (1год), а затым – ксёндз Вайцех Вішнеўскі (10 год). Сучасны ксёндз Ігар Анісімаў працуе ў Першамайскім прыходзе ўжо трэці год. Гэта малады, вясёлы, энергічны чалавек, які нясе свет, задор, духоўны спакой сваім прыхажанам, а таксама аказвае мецэнатаўскую дапамогу мясцоваму дзіцячаму садку.

Багаслужэнне ў касцёле вядзецца на польскай, беларускай і рускай мовах. Каталіцкі прыход налічвае прыблізна 700 чалавек.

**Вядучы:** Шмат цікавага падрыхтавала для наступнай старонкі нашага часопіса **“Вёска і калгас”** група “Крывічы”

Гучыць музыка песні “Ох і сеяла Ульяніца лянок”

**1-ы чытальнік**

Я шчаслівы, што ў суджаны час
Нарадзіўся на гэтай зямлі,
Дзе такія густыя лясы
І такія спакойныя рэкі.
Дзе вясной – непаўторна штораз –
Зелянеюць разлогі-палі,
Дзе ўладар гэтай дзіўнай красы –
Ты, народ мой, на вечныя вякі.

**2-і чытальнік**

Я параўнаю з дзівасілам
Зямлю, што дадзена мне ў спадчыну,
Дзе па вясне дужэюць крылы,
Вяртае вырай мова матчына.
Магчыма, тым і ганаруся,
Што з нашай глебы прарасло
І сонца вечнай Беларусі,
І мовы вечнае святло!

**Вядучы:** Кожны з вас можа прыгадаць мясціны роднага краю, адкуль пачаўся жыццёвы шлях.

1.Аповяд пра вёску Скарбы.

2.Аповяд пра вёску Дудкі.

3.Аповяд пра вёску Матылі.

4.Аповяд пра вёску Замасцяны.
5.Калгас “Першамайск-Агра”

Сюды ад ранку гаманіць і піць ваду
Ішлі без перастанку людзі.
А сёння ўжо радзей, чуваць, рыпіць
Наш журавель ля адзінокай студні.
І усё, што пааблазана было гарэзамі,
Паціху зарастала
У сумётах, што ўчора намяло,
Старая вёска век свой дажывала.
Адмерыў бог ёй дні і стаў лічыць,
Напэўна, ужо далічвае, як верыць?
Адчаю поўнымі вачмі глядзіць
З бырвення хата, нежывыя дзверы.
Заходжу ў сад, ён дзікі і пусты,
Сюды ад воч людскіх злятаюць совы,
А я ж з табою жыў усе гады,
Куточак ціхі, аднапавярховы.

**Вядучы:** чым мы можам ганарыцц?
**1-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваёй песняй!
**2-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваёй мовай!
**3-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваёй гісторыяй!
**4-ы чытальнік.** Мы ганарымся сваёй роднай зямлёй!
**5-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваімі людзьмі!

**Вядучы:** Наступная старонка нашага часопіса называецца **“Знакамітыя людзі нашага краю”**. Яна таксама абяцае шмат цікавых сустрэч. Прадстаўляе яе група “Скарынічы”.

1.Наш край звязаны так ці іначай з іменем грамадска і рэвалюцыйнага дзеяча, паплечніка К.Каліноўскага – Людвіка Нарбута.

2.Рычард Бялячыц

3.Уладзімір Руль

**Мы ўдзячны нвашым ветэранам**. У барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўдзельнічалі нашы землякі:

1.Місюкевіч антон Іванавіч

2.Глушань Мікалай Іванавіч

3.Амялевіч Іосіф Вікенцьевіч

**Удзельнікі Афганскай вайны** з'яўляліся нашы землякі:

1.Саковіч Дзмітрый Аляксандравіч

2.Кашлей Іван Станіслававіч

3.Ланеўскі Аляксандр Васільевіч

4.Сонька Анатолій Георгевіч

6.Лебядзевіч Віктар Матвеевіч

**Вядучы:** Апошняя старонка нашага часопіса – **"Адраджэнне".** Яе мы будзем складаць усе разам. Прэзідэнтам краіны пастаўлена задача – адрадзіць вёску. Ці магчыма адрадзіць наш край? Як гэта зрабіць? Хто будзе адраджаць вёску? Пытанняў многа. Я прапаную кожнай групе прадставіць свае праекты адраджэння, формы могуць быць самыя розныя. (Групы прадстаўляюць свае праекты).

**Вядучы:** Безумоўна праекты вашы заслугоўваюць увагі, усе яны вельмі цікавыя. Малайцы! Самае галоўнае, што вы неабыякавыя да лёсу нашага краю. А значыць вёска будзе жыць.

Гучыць песня на словы Я.Купалы "Спадчына".

**1-ы чытальнік**.

Ёсць на свеце такія краіны,
Дзе расце нават хлеб на раллі,
А мне нашы бярозы, каліны,
Нашы краскі ў душу заляглі.

**2-ы чытальнік.**

Я харошых краёў бачыў многа,
Многа пройдзена дальніх дарог,
А найлепшая тая дарога,
Што вядзе на бацькоўскі парог.

**3-ы чытальнік**.

Кажуць, дома вуглы дапамагаюць,
Дома жыць і рабіць весялей…

Чалавек без бацькоўскага краю
Як без песні ў гаі салавей.

**4-ы чытальнік.**

Тут і сонца, здаецца, святлейшае свеціць.
І дабрэйшыя ўсмешкі – у добрых людзей.
Ёсць нямала зямель багацейшых на свеце,
Толькі ты мне радней, даражэй і мілей.

## Литература


1. Памяць: Шчучынскі раен.-Мн.:Бел.энц.,2001.-С.184-380
2. Шчучыншчына.Мінулае і сучаснасць.-Гродна-Шчучын,1995-1997г.г.-С.170-203
3. Крень И.П.. Мараш Я.Н.: Историко-экономический очерк.-Мн.:Полымя,1989.-С.42-62